ІНДЭКС
«АЛІЎЕ»
19

ЛЮБОЎ
І ГАЛУБЫ
21

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

24 СНЕЖНЯ 2020 г.
ЧАЦВЕР
№ 251 (29365)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TV ПРАГРАМА

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр СУБОЦІН, намеснік прэм'ер-міністра:

«У Новы год галоўнае — адчуванне свята і чараўніцтва. Яны павінны прысутнічаць у жыцці кожнага чалавека, а дзіцяці — асабліва. Сям'я, радасць дзяцей — адны з галоўных каштоўнасцяў у краіне. Лепш за ўсё пра стаўленне да дзяцей, іх выхаванне і адукацыі сведчаць не словы, а канкрэтныя справы. Гэтаму аспекту ў Беларусі ўдзяляецца вялікая ўвага, зроблена вельмі многае ў плане стварэння ўмоў, інфраструктуры. Але наперадзе яшчэ нямала работы».

КАРАТКА

- **Дзяржузнагарод і Падзякі Прэзідэнта ўдастоены 90 прадстаўнікоў розных сфер дзейнасці.**
- Сталічны Дзед Мароз пачаў прымаць дзяцей у сваёй рэзідэнцыі.

- **Зменены парадак і ўмовы накіравання грамадзян у ЛПП.**
- Будаўніцтва міжнароднага выставачнага цэнтра пачалося ў «Вялікім камені».
- **НАН выбера 25 найлепшых маладзёжных праектаў для фіналу конкурсу «100 ідэй для Беларусі».**
- «Навагодні экспрэс» пачне курсіраваць па Дзіцячай чыгунцы з 24 снежня.
- **Экіпажы «МАЗ-СПОРТ-аўта» адправяцца на ралі «Дакар» 27 снежня.**

СВЯТА МІРУ, ЗГОДЫ І НАДЗЕІ

Хрысціянам Беларусі, якія святкуюць Нараджэнне Хрыстова 25 снежня

Дарагія суайчыннікі!

Сардэчна віншую вас са святам Нараджэння Хрыстова.

Гэтыя выдатныя зімовыя дні заўсёды азораны чаканнем цуду. Па добрай шматвяковай традыцыі вернікі пераасэнсоўваюць сваё жыццё, вучацца дараваць, дапамагаюць тым, хто жыве ў нястачы, адкрываюць сэрцы для сапраўднай любові, мудрасці і міласэрнасці.

Хрысціянскія каштоўнасці ў нашай краіне даўно сталі духоўным стрыжнем, які аб'ядноўвае прадстаўнікоў розных нацыянальнасцяў, якія ствараюць атмасферу ўзаемнага даверу, падтрымкі, талерантнасці, павагі і гасціннасці, якой славіцца Беларусь.

Хай і сёння святло Каляднай зоркі прынясе мір, згоду і надзею.

Ад усёй душы жадаю вам і вашым блізкім здароўя, шчасця і дабрабыту.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Будслаў. Касцёл Унебаўзяцця Найсвяцейшай Дзевы Марыі.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Год малой радзімы: вынікі

Анатоль ЛІС:

«Выдаткаваць сродкі з бюджэту, правесці за іх добраўпарадкаванне — важна, але не менш важна выйсці на суботнік, пасадзіць дрэва, вырасціць кветку, прыбраць двор»

Працягваем публікацыю матэрыялаў праекта, прымеркаванага да трылогіі Года малой радзімы. Пра асаблівасці работы на Брэстчыне, знакавыя мясціны і аб'екты рэгіёна сённяшняя гутарка са старшынёй Брэсцкага аблвыканкама Анатолем ЛІСАМ.

ЭКАНОМІКА ВА ЎМОВАХ ПАНДЭМІІ

— Прапаную пачаць размову са становішча ў эканоміцы, бо ажыццяўленне любых праектаў магчыма пры стабільных паступленнях у бюджэт. Год 2020-ы, які сыходзіць, быў надзвычай складаны і перш за ўсё з-за эпідэмічнай сітуацыі. Як у такіх няпростых умовах працавала эканоміка з яе адкрытымі межамі? Як складвалася сітуацыя ў плане экспарту тавараў і паслуг?

— Сапраўды, складаная эпідэмічная сітуацыя, што ўзнікла ў свеце з-за пандэміі, не магла не паўплываць на эканоміку, у тым ліку і нашай вобласці. Фактычна няма ніводнай галіны, якая б сёлета не панесла нейкія страты. Але ж найбольш пацярпелі, на мой погляд, прадпрыемствы сферы паслуг.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!
Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал або I паўгодзе 2021 года
НАЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

Рост рэальных даходаў і інфляцыя — не больш за 5 працэнтаў

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка зацвердзіў прагнозныя параметры на 2021 год, падпісаўшы адпаведныя ўказы.

Указ № 480 «Аб найважнейшых параметрах прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2021 год» устанаўлівае наступныя найважнейшыя параметры, скіраваныя перш за ўсё на паляпшэнне якасці жыцця:

рост рэальных наяўных грашовых даходаў насельніцтва на ўзроўні 101,6 % (у працэнтах да 2020 года),

забеспячэнне ўзроўню беспрацоўя ў працаздольным узросце па метадалогіі Міжнароднай арганізацыі працы на ўзроўні 4,2—4,4 %,

увод жылля ў эксплуатацыю, якое будуецца з дзяржаўнай падтрымкай, — не менш за 1 млн кв. м,

утрыманне росту цэн на сацыяльна значныя тавары на ўзроўні не больш за 104,9 % (снежань 2021 года да снежня 2020 года). Гэты паказчык у якасці найважнейшага ўстаноўлены ўпершыню. Ён уключае змяненне цэн на асноўныя тавары, якія выкарыстоўваюцца насельніцтвам паўсядзённа. Таму для сацыяльнай абароненасці насельніцтва мэтавы параметр паказчыка ўстанаўліваецца ніжэй за ўзровень агульнай інфляцыі (5 %),

забеспячэнне долі інвестыцый у асноўны капітал у ВУП на ўзроўні 21,3—21,7 %,

дасягненне росту ВУП у 2021 годзе — 101,8 % (у працэнтах да 2020 года).

Кіраўнік дзяржавы таксама падпісаў Указ № 481 «Аб зацвярджэнні Асноўных напрамкаў грашова-крэдытнай палітыкі Рэспублікі Беларусь на 2021 год».

Манетарная палітыка ў 2021 годзе будзе скіравана на стабілізацыю інфляцыі, якая вымяраецца індэксам спажывецкіх цэн, на ўзроўні не больш за 5 %.

Забеспячэнне цэнавай стабільнасці будзе дасягацца Нацыянальным банкам у рэжыме манетарнага таргетавання з дапамогай кантролю над аб'ёмам грашовай прапановы. Збалансаванаму росту грашовай прапановы будзе спрыяць падтрыманне ў рэальным выяўленні працэнтных ставак у эканоміцы на станоўчым узроўні.

Захаванне фінансавай стабільнасці будзе ажыццяўляцца шляхам рэалізацыі мерапрыемстваў па абмежаванні сістэмных рызык, падтрымання ўзроўню золатавалютных рэзерваў, забеспячэння бяспечнага функцыянавання банкаў, нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых і некрэдытных фінансавых арганізацый, ААТ «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь», а таксама эфектыўнай работы плацежнай сістэмы.

Камунікацыйная палітыка Нацыянальнага банка будзе скіравана на павышэнне адкрытасці і празрыстасці грашова-крэдытнай палітыкі, якая праводзіцца ў Беларусі.

БелТА.

СТВАРАЛЬНІКІ НОВЫХ ТРАДЫЦЫЙ

Прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА ўчора ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды больш чым 60 прадстаўнікам розных сфер. Урачыстая цырымонія прайшла ў Палацы Рэспублікі.

За самаадданую працу і высокі прафесіяналізм асаблівыя словы падзякі кіраўнік урада выказаў работнікам аховы здароўя. «Сёння ўся краіна кажа вам дзякуй за тое, што вы штодня ратуеце чалавечыя жыцці», — падкрэсліў прэм'ер-міністр.

У ліку ўзнагароджаных таксама — педагогі, кіраўнікі ўстаноў адукацыі. «Менавіта дзякуючы вашаму таленту беларуская сістэма адукацыі паспяхова і годна развіваецца, актыўна ўкараняе сучасныя тэхналогіі і інавацыі ў адукацыйны працэс», — адзначыў Раман Галоўчанка.

Узнагароды ўручаны дзяржаўным служачым, дзеячам культуры і мастацтва, прадстаўнікам спартыўнай сферы, грамадскіх аб'яднанняў, ветэранскіх арганізацый, работнікам аграпрамысловага і энергетычнага комплексаў, сферы транспарту, камунікацый, будаўнічай галіны, падатковых органаў.

«У нашай маладой па гістарычных мерках дзяржаве ўжо склаліся свае працоўныя, культурныя традыцыі. І сярод стваральнікаў гэтых традыцый усе вы, безумоўна, знаходзіцеся на перадавой. Вы — гэта чалавечы капітал Беларусі. Упэўнены, што вы не спыніцеся на дасягнутым», — сказаў Раман Галоўчанка. Ён падзякаваў узнагароджаным за добрасумленнае стаўленне да працы, прафесіяналізм, самаадданасць пры выкананні свайго службовага абавязку, праяўленую ініцыятыву.

БелТА.

Хутчэй. Вышэй. Мацней

Нацыянальны Алімпійскі камітэт падвёў вынікі года

Выканкам Нацыянальнага Алімпійскага камітэта падвёў вынікі дзейнасці арганізацыі ў 2020 годзе і зацвердзіў план работы на 2021 год, які пройдзе пад знакам Алімпійскіх гульняў у Токіа і 30-годдзя НАК Беларусі, паведамілі ў прэс-службе НАК.

Галоўным накірункам дзейнасці НАК у 2020 годзе стала падтрымка і прасоўванне беларускіх ініцыятыў па актуальных пытаннях міжнароднага спартыўнага руху. У прыватнасці, пытанняў, скіраваных на паніжэнне суб'ектывізму судзейства, павелічэнне колькасці беларускіх прадстаўнікоў у міжнародных спартыўных структурах і дэпалітызацыю спорту ў цэлым.

Галоўнай падзеяй 2021 года стануць Алімпійскія гульні ў Токіа, што значна ўплывае на кірункі дзейнасці НАК у наступным годзе. Арганізацыя супрацоўнічае з нацыянальнымі федэрацыямі па відах спорту і праводзіць маніторынг заваявання алімпійскіх ліцэнзій беларускімі спартсменамі. Наладжана супрацоўніцтва з арганізацыйнымі камітэтамі Алімпіяды-2021 у Токіа і Алімпіяды-2022 у Пекіне, што дазваляе аператыўна і якасна вырашаць усе пытанні, звязаныя з удзелам беларускіх спартсменаў у будучых спаборніцтвах.

Падводзячы вынікі года, выканкам НАК станоўча ацаніў выступленне беларускай каманды на III Юнацкіх зімовых Алімпійскіх гульнях у Лазане, дзе хакеіст Ілья Корзун заваяваў залаты медаль, а біятланістка Юлія Кавалеўская — бронзавы.

У 2020 годзе НАК Беларусі рэалізаваў шэраг праектаў пры падтрымцы Алімпійскай салідарнасці, сярод якіх — папулярнае адукацыйнае выданне для шырокага кола чытачоў «Гісторыя алімпійскага руху для кожнага «Хутчэй. Вышэй. Мацней», якое выйшла ў свет у пачатку навучальнага года. У чэрвені стартаваў праект «Правілы жыцця беларускіх спартсменаў», які ўключае ў сябе серыю відэаролікаў і выданне кнігі. У гэтым годзе Нацыянальны Алімпійскі камітэт актыўна супрацоўнічаў з установамі адукацыі для папулярызацыі алімпійскіх каштоўнасцяў. Напрыклад, у 2020 годзе ў штаб-кватэры НАК былі праведзены экскурсіі для 705 чалавек. Асноўныя катэгорыі наведвальнікаў: навучэнцы ўстаноў агульнай, сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі. Удзел у экскурсіях бралі замежныя госці і члены афіцыйных дэлегацый, работнікі фізічнай культуры і спорту.

Праз цяжкія эпідэміялагічныя ўмовы некаторыя мерапрыемствы НАК Беларусі былі праведзены ў сацыяльных сетках. У Міжнародны дзень спорту на карысць развіцця і міру, 6 красавіка, беларускія спартсмены далучыліся да акцыі Міжнароднага Алімпійскага камітэта #StayStrong, #StayActive, #StayHealthy і на ўласным прыкладзе паказвалі ўсім аматарам спорту, як падтрымліваць добрую фізічную форму ў дамашніх умовах. На жаль, некаторыя мерапрыемствы былі адменены ці перанесены праз пандэмію каранавіруса.

Дзякуючы супрацоўніцтву з Расійскім міжнародным алімпійскім універсітэтам зацверджаны спіс з 40 спецыялістаў для атрымання дадатковай адукацыі на базе РМАУ. Беларускія спецыялісты стануць удзельнікамі адукацыйных праграм і праграм перападрыхтоўкі ў галіне спартыўнага менеджменту для сусветнай індустрыі спорту і алімпійскага руху.

На выніковым пасяджэнні выканкам НАК падоўжыў часовае прызнанне сямі грамадскіх аб'яднанняў: Беларускай федэрацыі пажарна-выратавальнага спорту, Федэрацыі экіпіровачнага і класічнага паўэрліфтынгу, Беларускай федэрацыі шашак, Беларускай федэрацыі кікбоксінгу і тайландскага бокса, Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Амерыканскі футбол», Беларускай федэрацыі чырлідынгу і каманд падтрымкі, Беларускага рэспубліканскага танцавальнага саюза.

Валерыя СЦЯЦКО.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б**
Продавец	**ОАО «МОТОВЕЛО», г. Минск, пр-т Партизанский, 8 (тел. +375 44 743 00 30) – производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 470-18Б/2017**
Предмет аукциона	
Предприятие как имущественный комплекс ОАО «МОТОВЕЛО» (регистрационный номер 0001427, свидетельство № 3420 от 04 января 2019 г.). Состав имущества и имущественных прав см. на сайте ipmtorgi.by	
Месторасположение производственной базы – **Минская обл., Минский р-н, Юзуфовский с/с, 39, район д. Лесины**	
Начальная стоимость без НДС – 56 017,32 бел. руб. (снижена на 40 %) Шаг аукциона без НДС – 2 800,87 бел. руб.	
Порядок ознакомления	Ознакомление заинтересованных лиц с предметом аукциона осуществляется в рабочие дни. Ответственное лицо: Чарный Дмитрий Николаевич, тел. +375 44 743 00 30

Задаток 3 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

Порядок оформления участия в торгах, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов определяются ст. ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».

Порядок оформления участия в аукционе: лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона в срок **до 17.00 18.01.2021** заявление на участие в аукционе с приложением документов согласно ст. 127 выше указанного закона.

Критерии выявления победителя аукциона: имущество считается проданным лицу, которое предложило на аукционе самую высокую цену.

Порядок оформления результатов торгов: Победитель торгов (претендент на покупку) в день проведения торгов подписывает протокол

Срок подписания договора купли-продажи	**15** (пятнадцать) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить продавцу и организатору торгов затраты на их проведение и оплатить организатору торгов установленное вознаграждение в размере 3 % от итоговой цены продажи предмета аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте ipmtorgi.by

Предыдущие извещения о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 15.05.2020, 18.07.2020, 15.10.2020, 27.11.2020; в журнале «Судебный вестник Плюс: экономическое правосудие» за 2020 год: № 7. – С. 59–60, № 9. – С. 57–58, № 10. – С. 52–53; № 11. – С. 60

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Аукцион состоится 19.01.2021 в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. **Заявления на участие и необходимые документы, в т. ч. перечисление задатка, принимаются с 9.00 24.12.2020 по 18.01.2021 до 17.00** по указанному адресу

Тел.: +375 17 280-36-37; +375 (44) 704-92-06, ipmtorgi.by.
E-mail: auction@cpo.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 24-63-12.

Продавец: Открытое акционерное общество «Витебскоблресурсы», 210034, г. Витебск, ул. Ленинградская, 193А, тел.: (0212) 65-71-98, (0212) 65-71-70.

Лот № 1. Транспортное средство ROLFO S-3363, 1997 г. в., тип – полуприцеп бортовой, рег. знак № В2228А, номер кузова: ZAHM3NBAJP0971088, цвет – красно-серый, инв. № 00200. **Нач. цена**: 2500,00 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 250,00 бел. руб.

Торги состоятся: **25.01.2021 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и окончания приема документов: с 28.12.2020 с 8.30 по 22.01.2021 до 17.30. Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566.** Место нахождение лота № 1: г. Витебск, ул. Ленинградская, 193А. **Условия аукциона:** Победитель аукциона (единственный участник) обязан: возместить затраты на организацию и проведение торгов в течение 10 рабочих дней с даты проведения торгов; возместить в течение 10 рабочих дней с даты проведения торгов расходы по проведению независимой оценки имущества в сумме 100,00 бел. руб. без НДС на р/с, указанный в протоколе аукциона; подписать договор купли-продажи в течение 12 рабочих дней с даты проведения торгов; оплатить за имущество в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи; оплатить НДС сверх цены продажи по ставке 20 %; оплатить расходы, связанные с переходом права собственности на имущество. **Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609.** Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. **Доп. информацию по торгам можно получить по тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by. Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375 (33) 6470770 – Буевич Алексей Демьянович.**

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор аукциона)
информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества Государственного предприятия «Спецсвязь»
(Продавец)

Лот № 1: грузовой вагон PEUGEOT BOXER, кузов (рама) № VF3YCBMFC11061742, г. в. – 2006.
Начальная цена с НДС – 9 360,00 руб.
Лот № 2: грузовой вагон PEUGEOT BOXER, кузов (рама) № VF3YCBMFC11206669, г. в. – 2007.
Начальная цена с НДС – 8 400,00 руб.
Местонахождение Лотов №№ 1–2: г. Минск, ул. Семенова, 14.
Аукцион состоится 26.01.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.
Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **gki.gov.by** и Организатора аукциона **ino.by.**

☎ Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

Бяспечна і цікава

ШКОЛЬНЫ «ВОДПУСК» — З КРЭАТЫВАМ!

У перыяд зімовых канікул, якія будуць доўжыцца з 25 снежня да 10 студзеня, для дзяцей, а таксама іх бацькоў у сталіцы арганізуюць шэраг мерапрыемстваў.

У Рэспубліканскім цэнтры экалогіі і краязнаўства Міністэрства адукацыі для ўсіх ахвотных прапанаваны экскурсіі, майстар-класы, святочныя праграмы і выставы. Аб гэтым расказала **намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце Вікторыя САБАЛЕЎСКАЯ.**

— Мы зацікаўлены ў тым, каб сем'і праводзілі больш часу са сваімі дзецьмі разам, таму амаль усе мерапрыемствы скіраваны ў тым ліку і на бацькоў. 26 снежня для дашкольнікаў пройдзе навагодняя забаўляльная праграма «Ну, пачакай: у гасцях у Эказнайкі», дзе юныя даследчыкі бліжэй пазнаёмяцца з прыродай. Традыцыйна цэнтр праводзіць конкурс «Лёд. Кветкі. Фантазія», па выніках якога 15 студзеня будзе арганізавана выстаўка найлепшых работ навучэнцаў. На працягу ўсіх канікул будзе функцыянаваць адукацыйная праграма «Падарожжа ў экасвет», у рамках якой усе ахвотныя змогуць наведаць нашу аранжарэю і паглядзець на тое, як растуць розныя ўнікальныя расліны. Зараз, напрыклад, ідзе паспяванне папаі. Таксама можна наведаць акварыум і куток жывой прыроды, у якім сёлета пасяліўся новы жыхар — пітон. З улікам узроставых асаблівасцяў і фізічнай падрыхтоўкі ўдзельнікаў будуць арганізаваны і спартыўна-забаўляльныя праграмы на скаладроме. Да таго ж педагогі цэнтра разам з дзецьмі правядуць творчыя майстар-класы па вырабе ёлачных цацак, а таксама сімвала новага надыходзячага года. Упершыню адбудзецца майстар-клас па малекулярнай кухні, дзе можна ператварыць звыклыя нам стравы ў чароўныя навагоднія карціны. А ў майстар-класе «Юны сіноптык» можна паўдзельнічаць у назіранні за ўмовамі надвор'я і нават самім паспрабаваць сябе ў ролі метэаролага. Традыцыйна будуць функцыянаваць аб'яднанні па цікавасцях, а таксама ўсім ахвотным прапануюць экскурсіі па сталіцы.

У час зімовых канікул дзеці і падлеткі часта гуляюць на вуліцы, катаюцца з горак на цюбінгах ва неўстаноўленых месцах. Такія забаўкі могуць прывесці да трагічных выпадкаў. Аб гэтым расказаў **намеснік начальніка аддзела прафілактыкі ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі ГУУС Мінгарвыканкама Яўген АБРАМОВІЧ.**

— Таму мы сумесна з супрацоўнікамі камунальных службаў абследуем гэтыя тэрыторыі, размяшчаем інфармацыйныя таблічкі, праводзім адпаведныя размовы як з дзецьмі, так і іх бацькамі. Асаблівая ўвага аддаецца падлеткам, якім патрабуецца дадатковае педагагічнае выхаванне. Да гэтай катэгорыі адносяцца тыя, хто знаходзіцца пад наглядам інспекцый па справах непаўналетніх, у сацыяльна небяспечным становішчы.

Супрацоўнік ГУУС нагадаў бацькам: заканадаўствам прадугледжана, што асобы, якія не дасягнулі 16-гадовага ўзросту, пасля 23 гадзін на вуліцы павінны знаходзіцца толькі ў суправаджэнні бацькоў або асоб, якія іх замяняюць. «Таксама ўзнікае вялікая праблема з выкарыстаннем піратэхнічных вырабаў. Мы тлумачым, што гэта павінны быць сертыфікаваныя тавары, якія трэба набываць у гандлёвых пунктах, што маюць ліцэнзію. На жаль, ёсць выпадкі траўміравання дзяцей ад піратэхнікі, і іх колькасць у святы штогод узрастае».

Дар'я ШЛАПАКОВА.

Беражыце сябе

НАВАГОДНІЯ ГІРЛЯНДЫ: БЛЯСК БЕЗ НЕБЯСПЕКІ

У пераднавагоднюю пару гірлянды як незаменны атрыбут свята — запатрабаваны тавар у пакупнікоў. Асартымент дэкаратыўнай святлатэхнікі сёння настолькі разнастайны, што ўвага спажыўца мусіць быць засяроджана не толькі на дызайне выбранай прадукцыі, але і на бяспецы.

Такія патрабаванні да гірляндаў устаноўлены ў адпаведных тэхнічных рэгламентах Мытнага саюза і ЕАЭС.

— Навагоднія гірлянды, якія выкарыстоўваюцца ў грамадскіх месцах, падлягаюць дэкларацыраванню адпаведнасці, а тыя, што мы набываем для дома, — сертыфікацыі на адпаведнасць патрабаванням тэхрэгламентаў «Аб бяспецы нізкавольтнага абсталявання» і «Электрамагнітная сумяшчальнасць тэхнічных сродкаў» і дэкларацыраванню адпаведнасці патрабаванням тэхрэгламенту «Аб абмежаванні прымянення небяспечных рэчываў у вырабах электратэхнікі і радыёэлектронікі», — растлумачыла **вядучы інжынер аддзела сертыфікацыі прадукцыі Беларускага дзяржаўнага інстытута стандартызацыі і сертыфікацыі (БелДІСС) Інэса КАВАЛЁВА.**

Перш чым атрымаць гэтыя дакументы і трапіць да спажыўца, гірлянды праходзяць выпрабаванні. Гэта амаль дзясятак паказчыкаў: па электрабяспецы, электрамагнітнай сумяшчальнасці, цеплавыя выпрабаванні, пыла- і воданепранікальнасць для прадукцыі, якая выкарыстоўваецца на адкрытым паветры. Правяраюцца таксама цеплаўстойлівасць, вогнеўстойлівасць і супраціўленне току паверхневага разраду. Усе выпрабаванні праводзяцца ў акрэдытаваных выпрабавальных лабараторыях.

Вядучы інжынер лабараторыі экспертызы выпрабавальнага цэнтра БелДІСС Алег КУЖКО расказвае: «Выпрабаваннем на электрычную трываласць з выкарыстаннем прыбора, які генерыруе высокае напружанне, ацэньваецца ізаляцыя гірлянды. Выпрабавальнае напружанне плаўна павышаецца ад нуля да 3000 В і падтрымліваецца на працягу адной хвіліны, а затым зніжаецца да нуля. Калі праз гэты прамежак часу не адбылося прабівання ізаляцыі, то на прыборы загараецца кнопка PASS, якая азначае, што гірлянда вытрымала выпрабаванне па гэтым паказчыку».

Такім чынам сертыфікат адпаведнасці будзе выдадзены, і такая гірлянда з'явіцца ў продажы. У яе якасці і бяспецы можна быць цалкам упэўненымі.

Але, на жаль, так бывае не заўсёды.

У гэтым годзе інспекцыямі Дзяржстандарта праведзена больш за 60 маніторынгаў і праверак, па выніках якіх забаронены ўвоз і рэалізацыя 22 найменняў небяспечных навагодніх гірляндаў, спынена дзеянне васьмі сертыфікатаў адпаведнасці, а таксама складзена каля 80 пратаколаў аб адміністрацыйных правапарушэннях.

— Выкарыстанне няякасных гірляндаў можа прывесці да кароткага замыкання і, як вынік, да ўзгарання. Адкрыты доступ да праводзячых частак можа прывесці да паражэння электрычным токам. А электрамагнітныя памехі могуць прывесці да збою ў рабоце іншых прыбораў, — папярэджвае **галоўны інспектар інспекцыі Дзяржстандарта па Мінскай вобласці і Мінску Вольга ЦАРУК.**

Небяспечныя і няякасныя гірлянды найчасцей прадаюцца на рынках і ў неспецыялізаваных гандлёвых аб'ектах. Як правіла, яны распаўсюджваюцца ва ўпакоўках без маркіроўкі на рускай мове альбо з мінімальнай інфармацыяй аб тавары, не маюць сертыфіката адпаведнасці.

Перад купляй гірлянды нялішне таксама будзе пераканацца ў тым, што той няма ў рэестры небяспечнай прадукцыі. У гэтым вам дапаможа Тэлеграм-канал Дзяржстандарта «Бяспека і якасць» (t.me/gosstandartby).

Дар'я ГАСЦІЛОВІЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Францыя прыадкрыла мяжу з Брытаніяй

Францыя часткова адкрыла мяжу з Вялікабрытаніяй, каб грамадзяне ЕС змаглі вярнуцца дадому. Аднавіліся авіяпералёты, чыгуначныя зносіны і паромы. Таксама назад на кантынент змаглі трапіць перавозчыкі грузаў. Як паведамлялася, на пад'ездах да тэрмінала ў Дуўры ў англійскім графстве Кент сабралася каля трох тысяч фур, і, мяркуючы па ўсім, не ўсе кіроўцы паспеюць вярнуцца дадому да Каляд. Уезд у Францыю будзе таксама дазволены і іншым катэгорыям асоб, якія здольныя даказаць неабходнасць паездкі і маюць адмоўны вынік тэста. У прыватнасці, гэта могуць быць медыкі, якія накіроўваюцца па рабоце ў краіны ЕС. Як вядома, днямі каля 40 краін, у тым ліку амаль усе 27 краін ЕС, закрылі свае межы для тых, хто прыязджае з Брытаніі, дзе была зафіксавана ўспышка новага, больш небяспечнага штама каранавіруса. Прадстаўнікі еўрапейскіх дзяржаў раіліся з нагоды далейшых дзеянняў. Агульнай стратэгіі выпрацавана не было, кожная з краін мае права ўстанавіць уласныя памежныя правілы.

У Ізраілі распусцілі парламент

Кнэсет (парламент Ізраіля) 23-га склікання быў аўтаматычна распушчаны з-за заканчэння тэрмінаў зацвярджэння дзяржбюджэту краіны. Тэрміновыя парламенцкія выбары ў яўрэйскай дзяржаве ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам адбудуцца 23 сакавіка 2021 года. Пра гэта паведаміла дзяржаўнае ізраільскае радыё Kan. «Мы зноў ідзём на выбары. Нас чакае складаны перыяд», — канстатаваў спікер Ярыў Левін. Трансляцыю вёў ізраільскі дзяржаўны парламенцкі тэлеканал. У адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам Біньямін Нетаньяху застаецца прэм'ерам да моманту прывядзення да прысягі новага кабміна, сфарміраванага па выніках маючых адбыцца выбараў. Радыё Kan адзначыла, што гэта будуць ужо чацвёртыя выбары ў Ізраілі менш чым за два гады.

Біл Гейтс прадказаў узмацненне пандэміі

У найбліжэйшыя месяцы можна чакаць узмацнення пандэміі каранавіруса насуперак ужо распачатай у многіх краінах вакцынацыі. Такое развіццё падзей прадказаў заснавальнік Microsoft Біл Гейтс, падводзячы вынікі года ў сваім асабістым блогу. «На жаль, мы пакуль не справіліся з цяжкасцямі», — напісаў Гейтс і растлумачыў, што камп'ютарныя мадэлі прагназуюць магчымае пагаршэнне глабальных праблем на працягу першых месяцаў 2021 года. Ён таксама падкрэсліў, што патрабуецца вывучыць новую мутацыю віруса, якая адрозніваецца павышанай заразнасцю. Мільярдэр нагадаў, што эфектыўнымі спосабамі прадухіляць распаўсюджванне хваробы застаюцца медыцынскія маскі і сацыяльнае дыстанцыяванне. Хоць яны, як і іншыя абмежаванні, захаваюцца ў наступным годзе, з часам сітуацыя стабілізуецца дзякуючы вакцынам.

Акцэнты

Выключна ў інтарэсах беларускага народа

Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь зрабіў заяву ў сувязі з прыняццем Еўрапейскім парламентам рэзалюцыі па Беларусі, паведамілі ў прэс-службе Савета Рэспублікі.

У тэксце дакумента звяртаецца ўвага, што 26 лістапада 2020 года Еўрапейскі парламент прыняў рэзалюцыю па Беларусі, якая чарговы раз мае зашмат абвінавачванняў, заснаваных на скажэнні і тэндэнцыйнай ацэнцы падзей, якія адбываюцца ў нашай краіне.

«Еўрапейскія парламентарыі пры гэтым нібы не чуюць меркавання большасці беларускіх грамадзян, якія зрабілі свой выбар і хочуць жыць у стабільнай і бяспечнай краіне», акцэнтуецца ўвага ў заяве.

Са свайго боку Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь разглядае прыняцце рэзалюцыі як непрымальнае ўмяшальніцтва ва ўнутраныя справы суверэннай і незалежнай дзяржавы. «Заклікі, якія ў ёй змяшчаюцца, да прымянення санкцый ставяць пад пагрозу дасягнуты прагрэс у супрацоўніцтве Беларусі і ЕС, уключаючы міжпарламенцкае ўзаемадзеянне», гаворыцца ў дакуменце.

У ім робіцца акцэнт на цвёрдай упэўненасці беларускіх парламентарыяў у тым, што ўсе спробы ціску на Беларусь і імкненне змяніць вектар развіцця дзяржавы з'яўляюцца неправамернымі і бесперспектыўнымі.

«Мы працягнем справу ўмацавання нашай краіны выключна ў інтарэсах беларускага народа», рэзюмуецца заява.

Блізкая ўлада

ТЭЛЕФАНУЙЦЕ Ў 2020-М

Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.

Тэлефонныя лініі **ў суботу, 26 снежня, з 9.00 да 12.00** правядуць:

✓ намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Генадзь Іосіфавіч БАРЫСЮК. Тэл. 8 016 221 31 21;

✓ старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Уладзімравіч ЦЯРЭНЦЬЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

✓ першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Ігар Мікалаевіч ЧАСНОК. Тэл. 8 023 233 12 37;

✓ намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл. 8 015 273 56 44;

✓ намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Сяргей Мікалаевіч МАСЛАЎ. Тэл. 8 022 250 18 69;

✓ намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Мікалай Міхайлавіч РАГАШЧУК. Тэл. 8 017 500 41 60;

✓ намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Арцём Мікалаевіч ЦУРАН. Тэл. 8 017 222 44 44.

Надвор'е

Нас чакаюць моцныя ападкі

Калі ў ноч на 25 снежня — дождж і мокры снег,
то ўдзень у асноўным снег

Вось і размяняў год сваю апошнюю дэкаду. Яна амаль адразу адзначылася багатым (хай і мокрым) снегам. Напярэдадні Новага года няўстойлівае надвор'е настрою нам не ўзніме. Праўда, да выхадных уначы злёгку падмарозіць, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

А вось на свята (каталіцкае Раство) 25 снежня надвор'е абумовіць цыклон, які перамяшчаецца з тэрыторыі Польшчы на поўнач Беларусі. Чакаецца воблачнае надвор'е. Уначы часам ападкі, у асобных раёнах па ўсходзе краіны моцныя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Удзень на большай частцы тэрыторыі краіны кароткачасовыя ападкі, у асноўным снег, мокры снег. Вецер паўднёвы з пераходам на паўночна-заходні ўмераны, удзень парывісты. Тэмпература паветра на працягу сутак ад нуля да 5 цяпла.

У суботу чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е. Уначы месцамі, а ўдзень на большай частцы краіны кароткачасовы снег. На дарогах месцамі галалёдзіца. Вецер заходні парывісты. Тэмпература паветра ўначы ад нуля да мінус 6 градусаў, удзень — ад 3 марозу да 2 цяпла.

Увага!

У сувязі з пагаршэннем надвор'я Дзяржаўтаінспекцыя просіць усіх удзельнікаў дарожнага руху быць вельмі ўважлівымі і асцярожнымі. Кіроўцам рэкамендуюць перад пачаткам руху старанна ачысціць аўтамабіль ад снегу, праверыць наяўнасць шкламыйнай вадкасці, спраўнасць шклоачышчальніка і прыбораў асвятлення. Дзяржаўтаінспекцыя заклікае ўладальнікаў транспартных сродкаў не пакідаць свае аўтамашыны на краі праезнай частцы на доўгі час, каб не перашкаджаць рабоце камунальнай і снегаўборачнай тэхнікі.

Сяргей КУРКАЧ.

В соответствии с постановлением Президиума ДОРПРОФСОЖ от 30.11.2020 № 200 **Первичная профсоюзная организация аппарата управления ОАО «Трест Белтрансстрой» сообщает о ликвидации.** Претензии кредиторов принимаются по адресу: г. Минск, ул. Советская, 8.

УНП 101030464

«...не менш важна пасадзіць дрэва, вырасціць

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У складанай сітуацыі аказаліся транспартныя арганізацыі. Закрыццё межаў суседніх дзяржаў і вымушаныя рэкамендацыі па абмежаванні руху насельніцтва ўнутры краіны прывялі да зніжэння пасажыразвароту ў цэлым па вобласці за 11 месяцаў больш чым на 20 працэнтаў і, як вынік, да істотнага зніжэння даходаў арганізацый галіны. Акрамя таго, як вядома, давялося павялічыць затраты на правядзенне санітарна-эпідэміялагічных мерапрыемстваў па апрацоўцы маршрутных аўтобусаў і іншых транспартных сродкаў для бяспекі пасажырскіх перавозак.

Закрыццё межаў нанесла адчувальны ўрон сферы турызму. Большасць тураператараў рэгіёна вымушаны былі прыпыніць сваю дзейнасць. Невялікае ажыўленне назіралася ў канцы лета, аднак яно было не доўгім. У выніку аб'ём аказаных турыстычных паслуг насельніцтву за студзень—верасень склаў усяго 18,1 працэнта ад узроўню мінулага года.

Таксама да ліку найбольш пацярпелых галін можна аднесці сферу грамадскага харчавання. З-за рознага роду абмежаванняў таваразварот грамадскага харчавання вобласці за 11 месяцаў у параўнанні з леташнім скараціўся на 17,7 працэнта.

«Разам, талакой, як гэта заўсёды рабілася ў Беларусі, мы справімся з любымі праблемамі і задачамі. Для гэтага ёсць трывалая аснова — любоў да роднай зямлі, вера ў свае сілы і магчымасці, вопыт і мудрасць старэйшага пакалення, энергія моладзі. Усё пералічанае, памножанае на працавітасць, дапаможа нам ва ўстойлівым развіцці і паляпшэнні якасці жыцця».

І, разам з тым, варта адзначыць, што ў асноўным нам удалося забяспечыць нармальнае функцыянаванне прадпрыемстваў усіх галін вытворчасці. Па выніках 11 месяцаў на 1,5 працэнта вырас аб'ём прамысловай прадукцыі. Тэмп росту валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі склаў 106,1 працэнта — гэта другі паказчык у краіне. Вытворчасць малака павялічылася на 6,7 працэнта. Значна выросла прадукцыйнасць малочнай галіны, па надоях ад каровы мы традыцыйна лідзіруем у краіне. Выраслі асноўныя паказчыкі ў галіне вытворчасці мяса.

Добры ўраджай сёлета атрымалі земляробы. У сельгасарганізацыях намалочана 1,4 мільёна тон збожжа (пасля дапрацоўкі) пры ўраджайнасці 37,9 цэнтнера з гектара, у тым ліку 167 тысяч тон кукурузы з ураджайнасцю 54,9 цэнтнера з гектара. У прамысловым сектары індэкс фізічнага аб'ёму за 11 месяцаў склаўся на ўзроўні 101,5 працэнта. І калі ў цэлым крыху знізіўся тэмп росту аб'ёмаў будаўніча-мантажных работ, то, напрыклад, для грамадзян, якія паляпшаюць жыллёвыя ўмовы з дзяржаўнай падтрымкай, увялі ў строй жылля 118,1 працэнта ад гадавога задання.

Што датычыцца экспарту тавараў і паслуг, то атрыманыя вынікі таксама абумоўлены ўплывам пандэміі. У цэлым па вобласці экспарт паслуг скараціўся амаль на трэць. Але ў кожнай галіне сітуацыя складвалася па-рознаму. І калі турыстычныя паслугі ў параўнанні з леташнім скараціліся на 75,2 працэнта, то аб'ём экспарту будаўнічых паслуг вырас больш чым на 5 працэнтаў. Нашы будаўнікі шмат папрацавалі за мяжой.

Экспарт тавараў у цэлым узрос. Традыцыйна вобласць утрымлівае першае месца ў краіне па аб'ёме экспарту сельгаспрадукцыі і прадуктаў харчавання.

У студзені—кастрычніку 2020 года экспартныя пастаўкі ажыццяўляліся ў 102 краіны свету. Пры гэтым ў краіны «дальняй дугі» экспарт вырас у два разы ў параўнанні з папярэднім годам.

ЦІКАВАЯ І БЯСПЕЧНАЯ ДЛЯ ІНВЕСТАРАЎ

— Пра паступальнае развіццё, добраўпарадкаванне, павышэнне дабрабыту людзей цяжка гаварыць, не абапіраючыся на даныя пра сур'ёзныя інвестыцыі. Якія інвестыцыйныя праекты рэалізоўваюцца цяпер, калькі спрыяльны інвестыцыйны клімат у вобласці?

— Для шырокага прыцягнення замежных інвестыцый у нас ёсць добрыя магчымасці. Перш за ўсё маю на ўвазе заканадаўчую базу, якая для гэтага створана. За пяць гадоў, пачынаючы з 2015-га, ад замежных інвестараў у вобласць паступіла 1,3 мільярда долараў, у тым ліку амаль 359 мільёнаў долараў прамых замежных інвестыцый. Нягледзячы на эканамічныя цяжкасці краін-суседзяў, выкліканых пандэміяй, нам удалося забяспечыць прыцягненне замежных інвестыцый на прыстойным узроўні.

Напрыклад, сёлета паступленне прамых замежных інвестыцый за студзень—верасень склала амаль 85 мільёнаў долараў, што на 23 мільёны больш, чым было ў аналагічным перыядзе летась. Такім чынам, рост паступлення замежнага капіталу ў эканоміку вобласці сведчыць пра цікавасць і бяспеку рэгіёна для замежных капіталаўкладальнікаў. У вобласці дзейнічае цэлы шэраг прэферэнцый, якія могуць быць карыснымі кампаніям з пункту гледжання падатковага планавання і аптымізацыі расходаў, напрыклад, дзейнасць у якасці рэзідэнтаў тэхнапарка ў сярэдніх і малых гарадах.

Акрамя таго, свабодная эканамічная зона «Брэст» на плошчы больш за 100 квадратных кіламетраў забяспечвае выгадныя ўмовы для вядзення бізнесу. Спалучэнне падатковых, мытных, адміністрацыйных ільгот і надзейных прававых гарантый дазваляе кампаніям-рэзідэнтам паспяхова рэалізоўваць інвестыцыйныя праекты і атрымліваць высокі прыбытак. Сёння ў нашым рэгіёне працуюць інвестыцыі з 32 краін свету. За апошнія гады асноўнымі краінамі-донарамі замежных інвестыцый былі Германія, Расія, Вялікабрытанія, Польшча, ЗША, Кіпр.

За пяцігодку ў вобласці рэалізаваны шэраг праектаў з удзелам замежных інвестараў. Многія праекты знаходзяцца на стадыі рэалізацыі цяпер. Можна сказаць пра самыя буйныя з іх. Гэта, напрыклад, будаўніцтва турыстычнага комплексу «ЭкаБелКолбавічы» каля вёскі Колбавічы Баранавіцкага раёна інвестарам з Расійскай Федэрацыі. У саміх Баранавічах узводзіцца памяшканне для вырошчвання грыбоў з уласнай кацельняй ТАА «ЭлегмаІнвест» з брытанскім капіталам. Вытворчасць мяккай мэблі на арандаваных плошчах прадпрыемства «Івацэвічдрэў» арганізоўвае нямецкі бізнесмен. Амерыканская карпарацыя «Сілікон Матэрыалз інк» прыйшла ў Пінск, каб наладзіць вытворчасць злітка монакрысталічнага крэмнію.

Літаральна нядаўна, летам гэтага года, прадпрыемству з удзелам польскага капіталу прададзены Гарынскі агракамбінат у Столінскім раёне. Новы ўласнік узяў абавязацельства не мяняць профіль прадпрыемства (гэта перапрацоўка агародніны, фруктаў, ягад, выпуск кансерваў), а таксама захаваць сярэдняспісачную колькасць работнікаў.

Найбольш перспектыўнымі на найбліжэйшыя гады выглядаюць такія праекты, як будаўніцтва транспартна-лагістычнага цэнтра па апрацоўцы грузаў у раёне вёскі Харытоны пад Брэстам, узвядзенне лагістычнага цэнтра каля вёскі Малыя Косічы Брэсцкага раёна.

Падчас пасадкі дрэў у парку Тысячагоддзя.

АСАБЛІВЫЯ ПРАЕКТЫ Ў ПЛАНЕ ДОБРАЎПАРАДКАВАННЯ

— Якую адзнаку па выніках трылогіі, на ваш погляд, усё ж варта паставіць берасцейцам за работу на сваёй зямлі?

— Думаю, мы заслужылі калектыўнай добрай адзнакі. Вядома, ёсць пэўныя праблемы, не ўсё ўдалося зрабіць, што запланавалі. Але і зроблена многа. Вялікая работа па добраўпарадкаванні праводзіцца ў райцэнтрах, малых гарадах, аграгарадках. За тры апошнія гады істотна папрыгажэлі Пінск і Баранавічы. Як вядома, праводзяцца ў жыццё распрацаваныя раней комплексныя планы па развіцці гэтых гарадоў. Скажам, у Баранавічах рэалізавана і на стадыі рэалізацыі дзясяткі інвестыцыйных праектаў, якія паспрыяюць перааснашчэнню і мадэрнізацыі прамысловасці. Усё ўзаемазвязана: стабільная работа прадпрыемстваў і калектываў забяспечваюць паступленні ў бюджэт горада, і вынікам становіцца яго далейшае паляпшэнне па ўсіх кірунках. А па добраўпарадкаванні самага вялікага райцэнтра вобласці зроблена нямала: пачынаючы ад рэканструкцыі вакзала Баранавічы-Палескія і заканчваючы пасадкай дрэў і ўладкаваннем газонаў і клумб на тэрыторыі новых садкоў і школ.

Запрашаю ўсіх паглядзець, як упрыгожаны, добраўпарадкаваны цэнтральныя вуліцы старажытнага Пінска. Горад, які мае 186 аб'ектаў са статусам гісторыка-культурнай каштоўнасці, асабліва папрыгажэў у 2019 годзе, калі быў культурнай сталіцай краіны. За тры гады ў Пінску былі заасфальтаваны дзясяткі вуліц, праведзены рамонт фасадаў дамоў і тратуараў. Варта сказаць, што работнікі камунальнай гаспадаркі творча падышлі да аздаблення гарадской тэрыторыі. Пешаходная вуліца Леніна стала асаблівым гарадскім праектам у плане добраўпарадкавання. На некаторых гістарычных будынках паявіліся інфармацыйныя таблічкі з QR-кодамі, што надзвычай зручна для гасцей горада.

У такім плане можна знайсці што сказаць пра кожны райцэнтр. Іванава, напрыклад, пераўтварылі да Дня пісьменства. Але не толькі цэнтры раёнаў вядуць пастаяннае добраўпарадкаванне. Дажынкі паспрыялі таму, што чатыры былыя райцэнтры — Давыд-Гарадок, Высокае, Ружаны, Дзівін — сёння выглядаюць не як былыя мястэчкі, а як сапраўды сучасныя, стыльныя невялікія гарадкі. Многія сельскія населеныя пункты набліжаюцца да гарадскіх стандартаў.

Сказанае вышэй мае на ўвазе найперш работу выканаўчай улады, канкрэтных арганізацый, выдаткаванне значных бюджэтных сродкаў. Але варта сказаць сёння і пра дзясяткі і сотні суботнікаў, акцый па азеляненні і добраўпарадкаванні,

выйсці на суботнік, кветку, прыбраць двор»

якія правялі працоўныя калектывы, актывісты па месцы жыхарства, проста нераўнадушныя людзі, што выйшлі і пасадзілі дрэва, навялі парадак у ваколіцы, каб горад ці вёска сталі прыгажэйшымі. І такіх прыкладаў, на шчасце, вялікае мноства. Таму і сказана напачатку, што ў цэлым мы з вамі, жыхары вобласці, заслугоўваем добрай адзнакі за работу на сваёй зямлі.

ПАРКІ, СКВЕРЫ, АЛЕІ

— І ўсё ж можна, відаць, канкрэтызаваць, колькі разбіта новых сквераў і паркаў, колькі дрэў пасаджана. Якія ініцыятывы знайшлі падтрымку мясцовай улады, каб кожны населены пункт, кожны куток малой радзімы меў годны выгляд?

— У Брэсце, напрыклад, з'явіліся цалкам новыя паркі і скверы ў год 1000-гадовага юбілею. Гэта парк 1000-годдзя, сад бесперапыннага цвіцення на Набярэжнай, Пушкінскі сквер і іншыя. У абласным цэнтры высаджаны дзясяткі памятных алей. Амаль ва ўсіх гарадах паявіліся алеі сямейных дрэў альбо прымеркаваныя да памятных дат і падзей. І галоўнае, што тое не носіць характар кампаній: гэта пастаянная работа па азеляненні, навядзенні парадку на зямлі.

«Менавіта родная зямля сілкуе нас і натхняе на добрыя справы. Таму трэба з любоўю ставіцца да родных мясцін, з пашанай — да людзей-землякоў, якія выхавалі, дапамаглі ў станаўленні асобы кожнага з вас. І, што вельмі важна, неабходна быць адказнымі за лёс свайго краю, а гэта значыць, — працаваць так, каб з году ў год наша Радзіма, вялікая і малая, развівалася і квітнела».

Вось толькі з пачатку бягучага года ў населеных пунктах вобласці пасаджана амаль 78 тысяч дрэў, больш за 30 тысяч кустарнікаў. Праведзены работы па добраўпарадкаванні і рамонце 362 спартыўных і дзіцячых гульнявых пляцовак, 202 кантэйнерных пляцовак для збору адходаў, з іх 264 для раздзельнага збору. Праведзены рамонт 182,5 тысячы квадратных метраў вулічна-дарожнай сеткі, рэканструкцыі 21,3 гектара газонаў. А яшчэ чатыры зоны адпачынку аснашчаны пітной вадой, абсталяваны 25 спартыўных пляцовак у месцах адпачынку каля вады, праведзена рэкультывацыя 25 міні-палігонаў. Знарок прыводжу, на першы погляд, многа лічбаў, каб падкрэсліць, якая вялікая работа праведзена нават за адзін няпоўны год для паляпшэння нашых месцаў жыхарства, навакольнага асяроддзя і якасці жыцця ў цэлым.

Думаю, са школьнай праграмы многія памятаюць верш Петруся Броўкі: *«Мая айчына — поле, нівы, // Над Нёманам зялёны гай, // Прыгожы Брэст і Мінск шумлівы...»* Паўвека назад папярэднікі заслужылі такой высокай ацэнкі, якая знайшла ўвасабленне нават у паэтычным слове. Так што мусім адпавядаць.

МІЖНАРОДНЫЯ ТУРЫСТЫЧНЫЯ АБ'ЕКТЫ

— Малую радзіму ўпрыгожваюць яе жамчужыны — помнікі гісторыі і культуры. Чым са зробленага за апошнія гады можна ганарыцца? А што ў найбліжэйшых планах?

— На шчасце, у нас нямала аб'ектаў, якімі мы па праве ганарымся, якія выклікаюць цікавасць у нашых людзей і гасцей з многіх краін свету. У першай шарэнзе такіх помнікаў — Ружанскі палацавы комплекс роду Сапегаў, помнік архітэктуры XVIII стагоддзя ў стылі позняга класіцызму, які часта яшчэ называюць беларускім Версалем. Работы па яго аднаўленні былі распачаты ў 2008 годзе, у 2011 годзе адкрыты музей. Адноўлены ўязная брама, усходні і заходні флігелі. Зараз вядзецца рэстаўрацыя Усходняга корпуса.

Наведвальнікаў Ружанскага палацавага комплексу часцей за ўсё цікавяць адноўленыя інтэр'еры XVII—XVIII стагоддзяў, у якіх праводзяцца тэатралізаваныя гістарычныя рэканструкцыі, а таксама ўрачыстыя цырымоніі рэгістрацыі шлюбу ў гістарычнай атмасферы.

Косаўскі палацава-паркавы комплекс стаў міжнародным турыстычным аб'ектам, прызнаны перспектыўным камісіяй ЮНЕСКА. Рэстаўрацыя вядзецца таксама больш за 10 гадоў. У 2017 годзе ў палацы адкрылася першая музейная экспазіцыя, сёлета першых наведвальнікаў прынялі рэстаран «Граф Пуслоўскі» і гатэль «Пуслоўскіх». У планах на 2021 год — адкрыццё пастаяннай музейнай экспазіцыі на першым паверсе палаца і белай бальнай залы. Таксама плануецца аднаўленне шкляной аранжарэі Пуслоўскіх, адкрыццё бібліятэкі ў галерэі, правядзенне розных фестываляў.

Летась распачаты аднаўленчыя работы на аб'екце «Сядзібна-паркавы ансамбль у вёсцы Заказель Драгічынскага раёна. Рэстаўрацыя капліцы». На фінансаванне скіраваны сродкі фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва, а таксама раённага бюджэту.

З нашым краем звязаны жыццё і творчасць унікальнай асобы ў гісторыі беларускай і еўрапейскай культуры Напалеона Орды. На радзіме мастака ў вёсцы Варацэвічы Іванаўскага раёна створаны музейны комплекс — карцінная галерэя і музей Напалеона Орды. Побач ва ўрочышчы Чырвоны Двор на старадаўнім фундаменце адноўлены сядзібны дом Ордаў. Зараз вядзецца афармленне экспазіцыі, у якой будзе адноўленая атмасфера шляхецкай сядзібы XIX стагоддзя. У 2021 годзе плануецца адкрыццё першай чаргі. Работа над другой чаргой экспазіцыі будзе працягнута ў 2022 годзе.

Відаць, было б не зусім правільна не сказаць пра знакавы аб'ект Брэсцкай вобласці Брэсцкую крэпасць-герой. Мемарыяльны комплекс — аб'ект, які ўвесь час развіваецца. Толькі за апошнія два гады тут адкрыліся два новыя музеі: «Летапіс Брэсцкай крэпасці» летась і «Абарона Усходняга форта» — сёлета. Наступны — год 80-годдзя абароны крэпасці і пачатку Вялікай Айчыннай вайны, а таксама 50-годдзя адкрыцця мемарыяльнага комплексу. Да юбілеяў будзе прымеркавана шэраг мерапрыемстваў.

ГАЛОЎНЫ СКАРБ МАЛОЙ РАДЗІМЫ

— На вашу думку, найбольшы гонар Берасцейскага краю — гэта...

— Вядома, людзі. Менавіта яны, прафесіяналы, сумленныя, адказныя, з актыўнай жыццёвай пазіцыяй — самы вялікі гонар і набытак вобласці. Дзякуючы іх працавітым рукам, розуму, таленту наш рэгіён развіваецца і дасягае ўражлівых поспехаў у многіх галінах народнай гаспадаркі.

Напярэдадні навагодніх свят, карыстаючыся магчымасцю зрабіць гэта са старонак найстарэйшай беларускай газеты, шчыра дзякую працаўнікам рэгіёна за іх уклад у агульную скарбонку. Упэўнены, што разам, талакой, як гэта заўсёды рабілася ў Беларусі, мы справімся з любымі праблемамі і задачамі. Для гэтага ёсць трывалая аснова: любоў да роднай зямлі, вера ў свае сілы і магчымасці, вопыт і мудрасць старэйшага пакалення, энергія моладзі. Усё пералічанае, памножанае на працавітасць, дапаможа нам ва ўстойлівым развіцці і паляпшэнні якасці жыцця. Вельмі хочацца, каб маладыя, перспектыўныя юнакі і дзяўчаты звязвалі будучыню са сваёй малой радзімай, тым самым папаўняючы залаты фонд Берасцейшчыны.

— Што значыць малая радзіма асабіста для вас, Анатоль Васілевіч?

— Мне здаецца, кожнаму чалавеку дарагі той куточак, дзе ён нарадзіўся, зрабіў першыя крокі і адкуль пайшоў у вялікае жыццё. Ёсць такі і ў мяне. Праўда, з часам у многіх з нас з'яўляецца яшчэ адна малая радзіма — там, дзе жывеш і працуеш. На сёння такім месцам для мяне стала Брэсцкая вобласць. За шэсць гадоў я пазнаў гэты дзівосны край і яго людзей. Сустракаючыся з моладдзю, заўсёды кажу ім: менавіта родная зямля сілкуе нас і натхняе на добрыя справы. Таму трэба з любоўю ставіцца да родных мясцін, з пашанай — да людзей-землякоў, якія выхавалі, дапамаглі ў станаўленні асобы кожнага з вас. І, што вельмі важна, неабходна быць адказнымі за лёс свайго краю, а гэта значыць — працаваць так, каб з году ў год наша Радзіма, вялікая і малая, развівалася і квітнела.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Косаўскі палацава-паркавы комплекс стаў міжнародным турыстычным аб'ектам, прызнаны перспектыўным камісіяй ЮНЕСКА.

Блізкая ўлада

ФЕЛЬЧАР ПАТРЭБНЫ Ў ВЁСЦЫ, БАСЕЙН — У ГОРАДЗЕ

Прамую лінію з жыхарамі вобласці правёў у мінулую суботу старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль ЛІС

Да губернатара на гэты раз дазваніліся 30 чалавек з Брэста, Баранавіч, Пінска, Бярозаўскага, Баранавіцкага, Маларыцкага, Пружанскага, іншых раёнаў. Пытанні датычыліся добраўпарадкавання, рамонту дарог, медыцынскага абслугоўвання, будаўніцтва новых аб'ектаў.

Жыхары вёскі Варанілавічы Пружанскага раёна паскардзіліся, што з лета не працуе ФАП, малады спецыяліст звольнілася пасля адпрацоўкі размеркавання, а на яе месца нікога не накіравалі. Цяпер да вяскоўцаў прыязджае ўрач па графіку, а ў астатні час трэба ехаць на прыём у паліклініку ў Ружаны. А зараз, падчас пандэміі, людзям неабходна максімальна абмяжоўваць паездкі. З гэтым пагадзіўся кіраўнік вобласці і паабяцаў паспрыяць вырашэнню праблемы.

Як растлумачыла карэспандэнту газеты **старшыня Ружанскага сельвыканкама Аксана ЮРКОЎСКАЯ,** да яе таксама звярталіся з гэтым пытаннем жыхары вёскі. Камплектацыяй кадраў займаецца галіна аховы здароўя, а яна, як відаць, не прадугледзела сітуацыю і своечасова не знайшла спецыяліста. Але, паводле звестак кіраўніка мясцовай улады, гэтым займаюцца. «Вакансію запаўняюць неабавязкова маладым спецыялістам. Бывае, спецыяліст пераедзе ў нашы мясціны з іншых, бывае, жанчына выходзіць з дэкрэтнага водпуску, ёй неабходная работа... Адлегласць ад Варанілавіч да Ружан — шэсць кіламетраў, і ў іншай эпідсітуацыі адсутнасць фельчара не ўспрымалася б так востра, а цяпер гэта стала сапраўднай праблемай. Але пытанне на кантролі, спадзяёмся, што ў найбліжэйшы час яно вырашыцца», — пераканана старшыня сельскага Савета.

Жыхар Ляхавіч, што пазваніў на прамую лінію, прасіў пабудаваць басейн у іх райцэнтры. Але кіраўнік рэгіёна патлумачыў, што вялікага басейна няма нават у Баранавічах, дзе пражывае 180 тысяч чалавек. Таму будаваць у перспектыве давядзецца найперш у Баранавічах. А ў Ляхавічах, якія размешчаны ў 30 кіламетрах ад вялікага горада, трэба разгледзець будаўніцтва невялікага басейна, напрыклад, у школе альбо дзіцячым садку.

Як заўсёды, ад тэлефонных абанентаў паступалі пытанні па добраўпарадкаванні, рамонце дарог, паляпшэнні якасці пітной вады, іншых надзённых праблемах. А вось жыхар вёскі Дамачава Брэсцкага раёна заклапочаны тым, што пад пагрозу зрыву трапіла навагодняя традыцыя — у вялікім населеным пункце не працуе лазня.

Усе аўтары зваротаў атрымалі тлумачэнні, парады. Па некалькіх найбольш актуальных пытаннях адказным асобам дадзены даручэнні.

Яна СВЕТАВА.

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09, BELTORGI.BY
Продавец: **ОАО «Лоевский КБО»** (УНН 400028996) 247095, Гомельская обл., г.п. Лоев, ул. Ленина, 24а, тел./факс: +375 232 31-59-72 / 25-26-63, тел. +375 29 135-78-72
Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **5 января 2021 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. без НДС
1	Капитальное строение, инв. № 340/С-314808, площадь – 87,6 кв. м, назначение – здание специализированное для бытового обслуживания населения. Местонахождение: Гомельская обл., Лоевский р-н, Карповский с/с, д. Карповка, ул. Юрия Гагарина, 17	2020,83
2	Капитальное строение, инв. № 340/С-314434, площадь – 471,6 кв. м, назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – здание столярного цеха. Местонахождение: Гомельская обл., Лоевский р-н, г. п. Лоев, ул. Батова, 59А	10020,83
3	Капитальное строение, инв. № 340/С-314435, площадь – 41,5 кв. м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Местонахождение: Гомельская обл., Лоевский р-н, г. п. Лоев, ул. Батова, 59А/1	833,33
4	Капитальное строение с инв. № 340/С-313948 общей площадью 140,9 кв. м, назначение – здание специализированное для бытового обслуживания населения. Составные части и принадлежности: терраса, крыльцо. Местонахождение: Гомельская обл., Лоевский р-н, Бывальковский с/с, д. Бывальки, ул. Ермакова Ф.А., 17	3708,33

Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

Для участия в торгах необходимо в срок с 25.12.2020 г. 09.00 по 04.01.2021 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY, 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и оплатить аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете 11.12.2020 г.

ИЗВЕЩЕНИЕ (ИНФОРМАЦИЯ) О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «МГЦН» извещает о проведении 26 января 2021 г. аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды имущества в рамках 298-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной и иной собственности (далее – имущество)

№ предмета аукциона	Местонахождение имущества	Площадь (кв. м)	Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы или размер арендной платы	Начальная цена права заключения договора аренды имущества (руб.)	Целевое использование имущества	Сумма задатка (руб.)	Наименование имущества, его характеристика, необходимые условия аренды и иные сведения
Арендодатель – Белорусский государственный университет, тел. +375 (17) 209 55 22							
57	г. Минск, ул. Чюрлениса, 7	562,6	3,0	2510,60	Под организацию точки общественного питания	251,00	Помещения общественного питания на 1-м этаже здания общежития № 4. (16*)
	16 Помещения общественного питания № 42 (4,8 кв. м); 41 (156,9 кв. м); 40 (27,9 кв. м); 39 (4,4 кв. м); 38 (3,5 кв. м); 37 (3,8 кв. м); 36 (93,5 кв. м); 35 (16,5 кв. м); 34 (5,9 кв. м); 33 (17,2 кв. м); 32 (13,0 кв. м); 31 (34,8 кв. м); 30 (17,3 кв. м); 29 (18,4 кв. м); 28 (9,1 кв. м); 27 (16,1 кв. м); 26 (22,7 кв. м); 25 (7,2 кв. м); 24 (8,2 кв. м); 22 (9,1 кв. м); 21 (4,6 кв. м); 20 (3,0 кв. м); 18 (6,0 кв. м); 17 (7,5 кв. м); 16 (3,3 кв. м); 15 (2,2 кв. м); 14 (1,8 кв. м); 13 (23,1 кв. м); 12 (1,4 кв. м); 11 (2,0 кв. м); 10 (17,4 кв. м). Отдельный вход со стороны улицы и внутренний со стороны общежития. Имеются естественное и искусственное освещение, отопление, вентиляция в рабочем состоянии, горячее и холодное водоснабжение, охранно-пожарная сигнализация с выводом сигналов на пульт централизованного наблюдения на вахту общежития. Электроснабжение – трехфазное, напряжением 220/380 Вт, осуществляется от двух секций ВРУ3. Установленная электрическая мощность электрооборудования кафе согласно проектной документации 06.052.0.13-ЭМ – 113,3 кВт (1 секция) и 43,3 кВт (2 секция). Учет потребляемой электроэнергии осуществляется отдельными электросчетчиками на ВРУ3. Кафе имеет свой теплоузел, расположенный в подвальном помещении общежития, со своим теплосчетчиком, имеется учет расхода холодной воды. Помещения передаются вместе с оборудованием и инвентарем согласно перечню оборудования и инвентаря. Оборудование и инвентарь передаются по отдельному договору. Необходим ремонт вытяжной вентиляции над электроплитами. Все работы за счет средств арендатора без последующей компенсации затрат*						
Арендодатель – Юхнович Татьяна Валентиновна, тел. +375 (29) 603 40 40							
58	г. Минск, тер. Подземные переходы, 23-1 (помещение на входной зоне станции метро «Уручье» по проспекту Независимости)	18,4	90 евро за 1 кв. м (17*)	82,11	Под объект розничной торговли, оказание услуг	8,20	Изолированное помещение на входной зоне станции метро «Уручье». Имеется энергоснабжение, водоснабжение, канализация, вентиляция. Необходимые условия: заключение договора на коммунальные услуги с обслуживающей организацией
	17 Арендная плата подлежит уплате в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на день совершения платежа*						
Арендодатель – городское унитарное предприятие «Вилейское ЖКХ», тел, +375 (1771) 209 99							
59	Минская область, Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Гагарина, 12/1	20,0	3,0	89,25	Под оказание парикмахерских услуг, розничную торговлю товарами для домашних животных, ветеринарными препаратами	8,90	Нежилое помещение в жилом доме. Имеются естественное освещение, холодное водоснабжение, отопление, электроэнергия. **Срок аренды 3 года.** (18*)
	18 Проведение текущего ремонта помещений, инженерного, санитарно-технического оборудования, установка приборов учета производятся за счет средств арендатора без последующей компенсации затрат*						
Арендодатель – УП «Жильё», тел. +375 (177) 76 85 32							
60	Минская область, Борисовский р-н, г. Борисов, ул. М. Горького, 94-89	143,2	3,0	639,03	Под офис, организацию торговли непродовольственной и (или) продовольственной группами товаров, оказание услуг (кроме ритуальных услуг и услуг по пользованию залами игровых автоматов, компьютерных игр и физкультурно-оздоровительной деятельности) с возможностью использования части помещения под склад	63,90	Часть изолированного нежилого помещения на 1-м этаже жилого дома. Стены панельные, вентиляция естественная, центральное отопление, освещение – электропроводка скрытая, полы – бетонные, плитка. **Срок аренды 3 года.** (19*)
61	Минская область, Борисовский р-н, г. Борисов, пр. Революции, 33	19,2	1,0	85,68	Под офис, организацию торговли непродовольственной группой товаров, оказание услуг (за исключением ритуальных услуг, ритуальных магазинов и услуг по пользованию залами игровых автоматов, компьютерных игр и физкультурно-оздоровительной деятельности) с возможностью, при необходимости, использования части помещения под склад	8,50	Нежилое помещение в подвале многоквартирного жилого дома. Стены – силикатные блоки, вентиляция естественная, центральное отопление, освещение – электропроводка скрытая, полы – дощатые. Электроснабжение отсутствует, имеется возможность подключения. **Срок аренды 3 года.** (19*)
	19 Необходимые условия: победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) помимо договора аренды обязан заключить договоры на вывоз твердо-бытовых отходов, на снабжение электрической энергией, на пользование тепловой энергией в горячей воде, на отпуск воды и прием сточных вод*						
62	Минская область, Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 8 Марта, 25-90	37,1	1,0	165,56	Под офис, административные цели, организацию торговли непродовольственной группой товаров, предоставление услуг (за исключением ритуальных услуг и по пользованию залами игровых автоматов и компьютерных игр, физкультурно-оздоровительной деятельности), склад	16,50	Часть изолированного нежилого помещения в подвале пятиэтажного жилого дома, состоящая из трех помещений (16,9 кв. м, 10,2 кв. м и 10,0 кв. м). Имеются естественное освещение, отопление, водопровод, канализация, горячее водоснабжение. Санузел и вход совместно с другими арендаторами. Электроснабжение отсутствует, имеется возможность подключения. **Срок аренды – 3 года.** (20*)
	20 При необходимости арендатора строительно-монтажные работы, ремонтно-восстановительные работы осуществляются арендатором собственными силами за счет собственных средств без последующего возмещения затрат. Необходимые условия: после заключения договора аренды победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) обязан заключить договоры на вывоз твердо-бытовых отходов, снабжение электрической энергией, пользование тепловой энергией в горячей воде, отпуск воды и прием сточных вод, а также застраховать сдаваемое в аренду недвижимое имущество за счет средств арендатора в пользу арендодателя*						
Арендодатель – РУП «Белстройцентр», тел. +375 (17) 317 12 16							
63	г. Минск, ул. Притыцкого, 87-248	18,3	7,1 БАВ	81,66	Под хранение транспортного средства	8,10	Машино-место на подземном этаже. Ограждающие конструкции – разметка. **Срок аренды – 3 года**

Договор аренды заключается сроком на пять лет, если иное не указано в настоящем извещении.

Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10, тел. + 375 (17) 360 42 22.

Аукцион состоится **26 января 2021 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).

Прием документов и консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 28 декабря 2020 г. по 20 января 2021 г. включительно** в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Заявления на участие в аукционе, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в аукционе, несут лица, их подавшие.

Порядок оформления участия в аукционе

К участию в аукционе допускаются юридические или физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, внесшие в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на указанный текущий расчетный счет сумму задатка по соответствующему предмету аукциона, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в торгах с приложением всех необходимых документов, заключившие с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – соглашение), зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах и получившие билеты участников аукциона с указанием порядковых номеров, под которым данные лица зарегистрированы.

При этом лицо, желающее принять участие в аукционе:

- уплачивает задаток по соответствующему предмету аукциона на расчетный счет BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционе № 298 от 26.01.2021 по предмету аукциона № ___;

- подает организатору аукциона заявление на участие в аукционе (бланк заявления можно получить у организатора аукциона) с приложением следующих документов:

юридическое лицо – резидент Республики Беларусь:

копии документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;

копии платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

юридическое лицо – нерезидент Республики Беларусь:

легализованной в установленном порядке копии учредительных документов и выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иного эквивалентного доказательства юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

копии платежного поручения либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

индивидуальный предприниматель:

копии документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;

копии платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

физическое лицо – копии платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

- заключает с организатором аукциона соглашение, бланк которого можно получить у организатора аукциона.

При подаче заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами и заключении соглашения физическое лицо, индивидуальный предприниматель предъявляют организатору аукциона документ, удостоверяющий личность, а представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность.

Порядок определения победителя аукциона

Аукцион проводится в порядке, предусмотренном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 (далее – Положение).

Перед началом аукциона организатор аукциона проводит заключительную регистрацию лиц, допущенных к участию в аукционе. Заключительная регистрация представляет собой замену организатором аукциона билетов участников аукциона на аукционные номера, под которыми участники аукциона будут участвовать в аукционе. После проведения аукциона участники аукциона обязаны вернуть эти номера организатору аукциона.

Аукцион проводит аукционист, определяемый организатором аукциона. Аукцион начинается с оглашения аукционистом правил проведения аукциона, шага аукциона. Шаг аукциона устанавливается аукционистом в пределах от 5 до 15 процентов от предыдущей цены предмета аукциона, названной аукционистом.

Аукцион по каждому предмету аукциона начинается с объявления аукционистом наименования, места нахождения, краткой характеристики недвижимого имущества, право заключения договора аренды которого выставляется на аукцион, начальной цены, срока, на который будет заключен договор аренды. После оглашения данной информации аукционист в соответствии с шагом аукциона объявляет первую цену предмета аукциона. Не допускается продажа предмета аукциона по начальной цене. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимет только один участник аукциона. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

Обязанности победителя аукциона (лица, приравненного к победителю аукциона):

подписать протокол о результатах проведения аукциона в день его проведения;

в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка;

в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение (информация о затратах доводится до сведения участников перед началом аукциона);

в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона заключить с арендодателем договор аренды имущества.

Размер штрафа, уплачиваемого участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 99 (девяносто девять) базовых величин на дату проведения аукциона.

Дополнительная информация

Базовая арендная величина (БАВ) с 01.10.2020 составляет 17,85 рубля;

наличие объекта недвижимости, право аренды которого выставлено на аукцион, в государственном списке историко-культурных ценностей по г. Минску можно уточнить на сайте Управления культуры Мингорисполкома http://uk.minsk.gov.by;

возможность осмотра имущества, право заключения договора аренды которого выставлено на аукцион, обеспечивает арендодатель;

организатор аукциона настоятельно рекомендует лицам, желающим участвовать в аукционе, уточнить у арендодателя возможность использования объекта под планируемые виды деятельности (в том числе с учетом требований санитарных и противопожарных норм), размеры арендной платы и коммунальных платежей, а также ознакомиться с проектом договора аренды имущества;

юридические лица и индивидуальные предприниматели производят оплату задатка исключительно платежным поручением;

при отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка, он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении;

организатор аукциона в течение 5 рабочих дней со дня его проведения возвращает участникам аукциона, за исключением случаев, предусмотренных Положением, внесенные ими задатки (сумма задатка, внесенного победителем аукциона, засчитывается при оплате им стоимости предмета аукциона);

договор аренды по результатам аукциона может быть заключен исключительно с участником аукциона, ставшим победителем (приравненным к нему лицом), заключение договора аренды, целевое назначение которого предполагает осуществление предпринимательской деятельности, с субъектом, который в силу законодательства не может осуществлять названную деятельность, не допускается;

Телефоны для справок: отдел аукционов – +375 (17) 360 42 22, бухгалтерия – +375 (17) 366 36 58, отдел аренды – +375 (17) 373 47 29.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – **www.mgcn.by** (раздел «Аукционы на право аренды помещений»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»); Минского областного исполнительного комитета – **www.minsk-region.gov.by;** Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»).

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

24 снежня 2020 г. № 49 (585)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

КАРЫСНЫЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ, ДЗЕЛАВЫ НАСТРОЙ

Спікер верхняй палаты Парламента Наталля КАЧАНАВА ўзяла ўдзел у сесіі Маладзёжнага савета (парламента) пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь, на якой былі падведзены вынікі яго работы ў другім паўгоддзі.

Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла каштоўнасць ініцыятыў, якія прагучалі на сесіі, назвала іх сапраўды карыснымі для краіны і грамадства. У прыватнасці, гэта платформа «Рух наперад», арганізацыя правядзення грамадскіх прыёмных, якія дзейнічаюць на пастаяннай аснове. Яна асабліва падкрэсліла значнасць абмеркавання ў маладзёжным асяроддзі прапаноў да Усебеларускага народнага сходу і маючай адбыцца канстытуцыйнай рэформы — сёння Маладзёжны парламент выступае пляцоўкай для камунікацыі розных прадстаўнікоў моладзі.

Наталля Качанава з цікавасцю ўспрыняла шэраг прапаноў выступоўцаў па ўдасканаленні сістэмы дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі. У прыватнасці, у яе выклікала пытанне ідэя стварэння дзяржаўнага агенцтва па рабоце з моладдзю, якія, па словах маладых парламентарыяў, добра сябе зарэкамендавалі ў Расіі і Узбекістане. Узнікла дыскусія. Спікер верхняй палаты парламента параіла больш мэтанакіравана і эфектыўна выкарыстоўваць магчымасці БРСМ.

Старшыня Савета Рэспублікі ў час выступлення на сесіі адзначыла, што ёй прыемна працаваць з Маладзёжным парламентам і за паўгода існавання яго ўжо ведаюць у краіне. Яна пажадала маладым парламентарыям больш актыўна ўдзельнічаць у рэгіянальных справах, не праходзіць міма негатыўных момантаў на месцах, разам з раённымі выканкамамі спрыяць іх вырашэнню. А ў дачыненні пытанняў, якія турбуюць людзей і не вырашаюцца на мясцовым узроўні, рэкамендавала паведамляць у Савет Рэспублікі, там дапамогуць.

Наталля Качанава таксама параіла часцей сустракацца з юнакамі і дзяўчатамі ў навучальных установах і разглядаць кожную такую сустрэчу як дыялогавую пляцоўку, адказваць на вострыя пытанні тых маладых людзей, якія маюць іншае меркаванне. Бо работа з людзьмі — галоўнае ў дзейнасці любога парламентарыя, у тым ліку і прадстаўніка Маладзёжнага парламента, гэта краевугольны камень, падмурак іх працы, звярнула ўвагу Старшыня Савета Рэспублікі.

Думаецца, цёплыя словы Наталлі Качанавай у адрас Маладзёжнага парламента цалкам заслужаныя. Вынікі яго дзейнасці ў другім паўгоддзі гавораць самі за сябе. Пры гэтым варта адзначыць удзел маладых парламентарыяў у барацьбе з распаўсюджваннем COVID-19. Старшыня Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, спорце і турызме Маладзёжнага парламента Уладзіслаў Воўчак расказаў журналістам, як студэнты Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта змагаюцца з пандэміяй у рэгіёне. Яны распрацавалі рэкамендацыі для правядзення масавых мерапрыемстваў. У абласным цэнтры адкрыты валанцёрскі штаб па барацьбе з COVID-19. Студэнты імкнуцца актыўна дапамагаць медыкам супрацьстаяць каранавіруснай навале.

Так, моладзь неабыякавая да ўсяго. На сесіі Маладзёжнага парламента зацвердзілі план яго работы на 2021 год, унеслі прапановы па ўкараненні грантаў у дзейнасць грамадскіх аб'яднанняў, акрэслілі абагульненыя ініцыятывы па вынікаў праекта «Беларусь будучыні» ад моладзі з рэгіёнаў.

Як паведаміў старшыня Маладзёжнага парламента Ягор Макарэвіч, ён і яго аднадумцы прапануюць у наступным годзе заняцца больш актыўнай папулярызацыяй дзяржаўнай сімволікі сярод моладзі. У прыватнасці, выкарыстоўваць такі просты спосаб: дзяржаўны сцяг дарыць кожнаму выпускніку ўстановы адукацыі.

Маладыя парламентарыі паклапаціліся і аб тэматычнай назве наступнага года. Прапаноў на сесіі прагучала шмат. Так, у мэтах захавання традыцыйных сямейных каштоўнасцяў прапаноўвалася аб'явіць 2021 год Годам сям'і ці, з улікам спробы некаторых заходніх аналітыкаў і даследчыкаў перапісаць гісторыю Другой сусветнай вайны, назваць 2021 год Годам захавання гістарычнай памяці.

Леанід ТУГАРЫН.

РАЗГЛЕДЖАНА НА СЕСІІ

Стымулы для топ-менеджараў

Якія прагрэсіўныя інстытуты з'явяцца для актывізацыі бізнес-супольнасці?

Навацыі ў законах, якія датычацца дзейнасці гаспадарчых таварыстваў, наспелі даўно. Пад гэтыя нормы трапляюць 64 тысячы суб'ектаў гаспадарання краіны, якія створаны ў форме акцыянерных таварыстваў, таварыстваў з абмежаванай (некаторыя — з дадатковай) адказнасцю — а гэта амаль палова ўсіх існуючых на тэрыторыі краіны камерцыйных арганізацый. Таму невыпадкова, што пакуль законапраект рыхтаваўся распрацоўшчыкамі, да яго была вельмі павышаная ўвага. Аб усіх «навінках» і змяненнях сенатарам на заключнай сёлетняй сесіі Савета Рэспублікі расказаў міністр эканомікі Аляксандр ЧАРВЯКОЎ.

Апцыёны працуюць на вынік

Ён паведаміў, што змены датычацца чатырох важных кірункаў: стварэння новых прагрэсіўных інстытутаў, паляпшэння ўмоў функцыянавання гаспадарчых таварыстваў, аховы правоў і інтарэсаў удзельнікаў і павышэння інфармацыйнай адкрытасці гаспадарчых таварыстваў. Разгледзім кожны больш падрабязна.

У дачыненні да новых інстытутаў гаворка ідзе аб трох навацыях. Першая — канвертацыя даўгоў акцый. На думку міністра, гэта найбольш актуальнае, істотнае і радыкальнае змяненне закона.

— Такая неабходнасць абумоўлена патрэбай у развіцці інавацыйных кампаній, пашырэнні магчымасці рэструктурызацыі пазыковых абавязацельстваў гаспадарчых таварыстваў. Законапраектам прапануецца дадзены механізм распаўсюдзіць на ўсе гаспадарчыя таварыствы, — растлумачыў ён.

Наступная навацыя — так званыя апцыёны, калі даецца магчымасць заахвочвання членаў органаў кіравання і іншых ключавых супрацоўнікаў акцыямі (долямі) гаспадарчых таварыстваў. Такая норма стане дадатковым і важным стымулам у павышэнні эфектыўнасці дзейнасці топ-менеджменту і ключавых супрацоўнікаў і, як вынік, дзейнасці самога таварыства. Бо ў такім выпадку актыўныя работнікі становяцца ўласнікамі, што стымулуе іх на дасягненне доўгатэрміновых вынікаў і фінансавай устойлівасці таварыства.

Навацыяй з'яўляецца і надзяленне ўдзельнікаў правам уносіць укłады ў маёмасць таварыства, якія не паўплываюць на павелічэнне статутнага фонду.

На думку міністра, такая норма ў заканадаўстве дазволіць аператыўна паляпшаць фінансавае становішча гаспадарчых таварыстваў, што можа разглядацца як інструмент аздараўлення, а таксама ўцягваць у гаспадарчае абарачэнне невыкарыстоўваемую і неэфектыўна выкарыстоўваемую маёмасць.

Таварыства з адным удзельнікам

Другі кірунак змяненняў у законе звязаны з паляпшэннем умоў функцыянавання гаспадарчых таварыстваў.

— Перш за ўсё гэта нормы аб магчымасці дыстанцыйна ўдзельнічаць як у рабоце агульнага сходу, так і назіральнага савета, — адзначыў Аляксандр Чарвякоў. — Гэта значна спрашчае ўдзел у рабоце як удзельнікаў таварыстваў, так і членаў наглядальных саветаў.

(Заканчэнне на 17-й стар.)

У ТЭМУ

КАБ БЫЛІ МІР І СПАКОЙ У КРАІНЕ

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА стала госцяй інфармацыйна-адукацыйнага праекта «ШАГ» — «Школа актыўнага грамадзяніна» — у сталічнай СШ № 118.

Па словах **дырэктара ўстановы адукацыі Мікалая КНЫША,** школа славіцца традыцыямі самакіравання. Тут актыўна развіваюць дзіцячае лідарства праз дзейнасць грамадскіх маладзёжных аб'яднанняў. Прадстаўнікі БРСМ, «Белай Русі», дэпутацкага корпуса, адміністрацый раёна, горада, спецыялісты і прафесіяналы розных кірункаў станавіліся гасцямі праекта «ШАГ».

Гэтым разам актыў 8—10-х класаў абмяркоўваў тэму «Я родным краем ганаруся і ведаю: я не адзін». **Намеснік дырэктара па выхаваўчай працы Святлана ПІСАРЭНКА** нагадала вучням пра трылогію Года малой радзімы і даведалася аб іх асацыяцыях з «родным куточкам». Віртуальнае падарожжа праходзіла па ўсёй краіне. Наталля Качанава падчас аповеду аб полацкай зямлі не ўтрымалася і з цеплынёй расказала пра сваю малую радзіму з яе ўнікальнай архітэктурай. Школьнікі распавялі аб сваіх дасягненнях і перамогах, дабрачынных і валанцёрскіх праектах.

Самая цікавая частка — пытанні госці. Адзін з самых актуальных — выбар будучай прафесіі. На думку Наталлі Качанавай, важна, каб школьнікі маглі больш камунікаваць з прафесіяналамі, даведваліся аб іх дзейнасці, тады ў падрастаючага пакалення будзе менш памылак пры выбары справы свайго жыцця.

«Якімі якасцямі павінен валодаць малады чалавек?» — пацікавіўся адзін з вучняў. «Павінен быць адказным, неабыякавым. І патрыётам. Нічога ў жыцці не атрымаецца без любові да мамы, родных, блізкіх, зямлі, дзе нарадзіўся. Галоўнае, каб у цябе было гэтае пачуццё. Як яго выхаваць? Пытанне да сям'і, бацькоў, школы», — адказала Наталля Качанава.

На пытанне пра самае патаемнае жаданне на Новы год яна адкрыта адказала: «Мір і спакой у нашай краіне. Каб мы былі адзіныя. Я хачу міру для вас, сваіх і вашых дзяцей, унукаў, праўнукаў».

Пасля пазнавальнага ўрока дзеці разважалі, як яны могуць у дарослым жыцці быць карыснымі роднай краіне, — спецыяльная карта Беларусі запоўнілася планамі добрых спраў. Нехта хоча стаць ландшафтным дызайнерам, каб зрабіць Мінск больш зручным для ўсіх гараджан. Хтосьці імкнецца прыносіць славу краіне на міжнародных спаборніцтвах, хтосьці — лячыць людзей, вучыць дзяцей. Але галоўнае — заставацца чалавекам пры любых абставінах, на любых пасадах. І Наталля Качанава цалкам пагадзілася, дадаўшы пры гэтым, што «ніякі інтэрнэт не заменіць чалавечых стасункаў».

«Мне вельмі спадабалася, уражанні цудоўныя, — падзялілася пасля сустрэчы старшыня Савета Рэспублікі. — Лічу, што мы павінны часцей бываць у школе, сустракацца з вучнямі, каб пачуць іх меркаванні, пытанні і данесці тую інфармацыю, якой самі валодаем». Яна пажадала дзецям дасягнення мэт і каб абраная прафесія не расчаравала.

Паводле БелТА.

Кавярня адкрылася, а потым зарэгістравалася

І як яна будзе працаваць — вызначыць сам уладальнік

Якія змены рыхтуюцца ў Законе «Аб дзяржаўным рэгуляванні гандлю і грамадскага харчавання ў Рэспубліцы Беларусь»?

Вядома, што дэпутаты Палаты прадстаўнікоў ужо разгледзелі гэты законапраект у двух чытаннях, зараз чарга ўхвалення членамі Савета Рэспублікі. На заключнай сёлетняй сесіі заканадаўчыя навацыі прэзентаваў **міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Уладзімір КАЛТОВІЧ.** Ён растлумачыў, што мэта законапраекта — удасканальванне нормаў існуючага закона з улікам практыкі яго выкарыстання, а таксама спрашчэнне патрабаванняў да вядзення бізнесу ў сферах гандлю і грамадскага харчавання, у тым ліку за кошт узмацнення механізмаў самарэгулявання суб'ектаў гаспадарання, мінімізацыі ўмяшальніцтва службовых асоб дзяржорганаў у іх работу, з захаваннем пры гэтым мінімальнага ўзроўню кантролю з боку дзяржавы.

У прыватнасці, прапануецца перайсці на заяўляльны прынцып адкрыцця гандлёвых аб'ектаў, пунктаў грамадскага харчавання, гандлёвых цэнтраў, рынкаў, ажыццяўлення гандлю ва ўсіх формах. Іншымі словамі, пасля адкрыцця такіх аб'ектаў іх уладальнік будзе накіроўваць паведамленне ў Гандлёвы рэестр толькі праз пяць дзён пасля іх адкрыцця.

Прапануецца і самастойнае вызначэнне суб'ектамі гандлю, грамадскага харчавання, адміністрацыямі гандлёвых аб'ектаў і рынкаў рэжымаў сваёй работы. Выключэнне робіцца толькі для тых, хто плануе працаваць пасля 23.00 і да 7.00. У такім выпадку рэжым неабходна ўзгадніць з адпаведным выканкамам па месцы знаходжання аб'екта.

Навацыяй з'яўляецца і прапанова самастойнага разліку суб'ектамі, якія ажыццяўляюць рознічны гандаль харчовымі таварамі ў гандлёвай сетцы ці буйной краме, іх долі ў аб'ёме рознічнага тавараабароту харчовых тавараў у межах адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак.

Праектам закона адмяняюцца некаторыя патрабаванні, якія дзейнічаюць зараз. Напрыклад, аб'екты грамадскага харчавання могуць стварацца без падзелу на тыпы і класы і не мець асартыментныя пералікі прадукцыі. Суб'ектам гандлю не трэба будзе даваць звесткі аб рознічным і аптовым тавараабароце ў Гандлёвы рэестр.

Адмяняецца таксама адміністрацыйная працэдура ўзгаднення правядзення кірмашоў з Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю, а таксама аблвыканкамамі. Выключаны патрабаванні да стварэння фірменных крам і фірменных секцый.

Са свайго боку **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл РУСЫ** расказаў калегам, што падчас работы над законапраектам профільнай камісіі былі прапановы па дадатковым рэгуляванні інтэрнэт-гандлю. У прыватнасці, прапанавана ўстанавіць нормы, якія прадугледжваюць неабходнасць размяшчаць на сайце інтэрнэт-крам інфармацыю аб юрыдычным адрасе асобы, якой належыць гэтая інтэрнэт-крама, нумары кантактных тэлефонаў службовых асоб, што маюць права прымаць рашэнні па зваротах спажыўцоў згодна з адпаведным заканадаўствам, а таксама інфармацыю аб правах спажыўцоў і абавязках інтэрнэт-крам.

— Дадзеныя прапановы былі падтрыманы зацікаўленымі дзяржаўнымі органамі і пасля прыняцця законапраекта будуць уключаны ў Правілы продажу тавараў пры ажыццяўленні рознічнага гандлю на ўзор, зацверджаных урадам, — адзначыў ён.

Старшыня профільнай камісіі падкрэсліў, што прыняцце закона будзе садзейнічаць сістэмнаму і ўзгодненаму прававому рэгуляванню ў сферы гандлю і грамадскага харчавання. Сенараты цалкам з ім пагадзіліся.

ПАПЯРЭДЖАННЕ ЗАМЕСТ ШТРАФУ

У Беларусі пашыраюцца меры прафілактыкі ў адносінах да правапарушальнікаў

Іх прапануюць выкарыстоўваць у рамках інстытута вызвалення ад адміністрацыйнай адказнасці. Якія яшчэ заканадаўчыя навацыі ўтрымліваюць абноўлены Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях і Працэсуальна-выканаўчы кодэкс ад адміністрацыйных правапарушэннях, расказаў дырэктар Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Вадзім ІПАТАЎ на заключным пасяджэнні чацвёртай сесіі Савета Рэспублікі.

У 90 % выпадкаў — папярэджанне

— Галоўная асаблівасць распрацаваных праектаў кодэксаў — прафілактычны і папераджальны характар іх норм. Сярод іх — вусная заўвага, папярэджанне і меры выхаваўчага ўздзеяння ў адносінах да непаўналетніх, — звярнуў ён увагу.

Дарэчы, прафілактычныя меры ўздзеяння прапануецца выкарыстоўваць у якасці альтэрнатывы адміністрацыйнай адказнасці. І тут самае галоўнае — адсутнасць прававых наступстваў, якія нясе за сабой адміністрацыйная адказнасць. Гэта значыць тое, што асоба, у дачыненні да якой будуць выкарыстаны меры прафілактычнага ўздзеяння, не будзе лічыцца прыцягнутай да адміністрацыйнай адказнасці.

Акрамя таго, істотна зменены змест саміх правапарушэнняў. Праект КаАП прадугледжвае дзяленне на катэгорыі парушэнняў у залежнасці ад ступені шкоднасці для грамадства і цяжару наступстваў. Такім чынам правапарушэнні можна падзяліць на тры катэгорыі. Разбіраемся, якія.

Першая — адміністрацыйныя правіннасці. Яны складаюць 26 % у агульным аб'ёме прадугледжаных законапраектам правапарушэнняў. Да іх распрацоўшчык законапраекта прапануе аднесці правапарушэнні, за якія можа накладвацца штраф, што не перавышае 10 базавых велічынь для фізічнай асобы, 25 — для індывідуальнага прадпрымальніка і 50 — для юрыдычнай асобы.

Другая катэгорыя — значныя адміністрацыйныя правапарушэнні (на іх долю прыпадае 67 %). Гаворка пра дзеянні, за якія можа быць накладзены больш высокі штраф або пакаранне ў выглядзе канфіскацыі, дэпартацыі.

І нарэшце, трэцяя — грубыя адміністрацыйныя правапарушэнні (7 %). Да іх адносяцца парушэнні, паўторнае ўчыненне якіх цягне за сабой крымінальную адказнасць, а таксама тыя, за што вінаватага могуць прыцягнуць да адміністрацыйнага арышту, пазбаўлення права займацца нейкім відам дзейнасці.

— З гэтымі катэгорыямі адміністрацыйных правапарушэнняў прапануецца звязаць інстытут вызвалення ад адміністрацыйнай адказнасці. Напрыклад, пры здзяйсненні ўпершыню адміністрацыйнай правіннасці замест адміністрацыйнага спагнання штрафу, як гэта робіцца цяпер, асоба будзе ад яго вызваляцца і толькі папярэджвацца, — растлумачыў Вадзім Іпатаў.

Як гэта будзе выглядаць на практыцы? Возьмем сітуацыю з размовай кіроўцы па мабільніку падчас руху — яго спыніць супрацоўнік ДАІ і высветліць, што Правілы дарожнага руху парушаны не былі. У такім выпадку кіроўцу чакае прафілактычная размова і папярэджанне. Але калі гэта не спрацуе і праз некалькі месяцаў яго зноў «застукаюць» за гутаркай за рулём, тады ўжо штраф не мінуе.

Аднак і тут ёсць нюансы. Калі кіроўца пагодзіцца з віной на месцы, то ў дачыненні да яго будзе дзейнічаць паскораны адміністрацыйны працэс і як вынік — штраф не будзе складаць больш за 0,5 базавай велічыні. Калі ж пачне «выкручвацца» і не будзе пагаджацца, працэс будзе весціся па агульных правілах і штраф можа дасягаць да дзвюх базавых велічынь. Карацей, думайце самі, вырашайце самі...

— Папярэджанне можа выкарыстоўвацца і па катэгорыі значных адміністрацыйных правапарушэнняў, але ў гэтым выпадку магчыма і накладанне адміністрацыйнага спагнання, — тлумачыць дырэктар Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў. — З улікам

> Такім чынам, ствараецца прававая аснова для бесканфліктнага і справядлівага прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці.

усяго, калі сёння папярэджанне можа выкарыстоўвацца па 236 саставах з 896 (у 26,3 % выпадкаў), то па праекце папярэджанне можна будзе выкарыстоўваць па 680 саставах з 750 (у 90,67 % выпадкаў).

Пазбаўленне пасведчання кіроўцы — з трох да пяці

Важна, што такое лаяльнае стаўленне не распаўсюджваецца на грубыя парушэнні Правіл дарожнага руху. Распрацоўшчыкі вылучылі 17 найбольш сур'ёзных і частых парушэнняў, за якія адразу «свеціць» штраф. Сярод іх парушэнне хуткасці, праезд на чырвонае святло, парушэнне правіл манеўравання і праезду скрыжаванняў і іншыя.

Такім чынам, ствараецца прававая аснова для бесканфліктнага і справядлівага прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці. Разам з тым пры грубых правапарушэннях, звязаных з «хуліганкай», крадзяжамі, гвалтоўнымі дзеяннямі, масавымі беспарадкамі і гэтак далей, захоўваюцца жорсткія меры рэагавання ажно да арышту.

А за такое сур'ёзнае парушэнне, як ваджэнне ў нецвярозым стане (звыш 0,8 праміле) штаф прапануюць павысіць удвая, і з трох да пяці гадоў павялічыць тэрмін пазбаўлення правоў на кіраванне транспартным сродкам «падшафэ».

— З улікам грамадска-палітычнага становішча, новых выклікаў і пагроз, праблемных пытанняў прававыкарыстальнай практыкі пры дапрацоўцы ў парламенце праект дапоўнены шэрагам палажэнняў аб узмацненні адказнасці за асобныя грубыя парушэнні грамадскага парадку. Гэтыя меры галоўным чынам датычацца парушэнняў, звязаных з масавымі мерапрыемствамі, непадпарадкаваннем законным патрабаванням службовых асоб, публічнымі абразамі і незаконным распаўсюджваннем персанальных даных, — дадаў Вадзім Іпатаў.

Грамадскія работы ад 8 да 60 гадзін

Наступная важная навацыя КаАП — змена падыходаў да тэрмінаў, падчас якіх асоба лічыцца прыцягнутай да адміністрацыйнай адказнасці. Сёння чалавек лічыцца не прыцягнутым да адміністрацыйнай адказнасці пасля года з моманту, як адміністрацыйнае спагнанне было выканана. Іншымі словамі, «таўро» правапарушальніка замацоўваецца за ім за любое правапарушэнне на дастаткова працяглы тэрмін. У новым законапраекце закладзены дыферэнцыраваны падыход: тэрмін у год захоўваецца толькі для тых, хто здзейсніў грубае адміністрацыйнае правапарушэнне. Асоба, якая здзейсніла адміністрацыйную правіннасць, не будзе лічыцца прыцягнутай да адказнасці з моманту выканання накладзенага спагнання. Напрыклад, пасля выплаты штрафу. А калі правапарушэнне значнае — праз шэсць месяцаў.

Праектам прадугледжана ўвядзенне новага адміністрацыйнага спагнання — гаворка ідзе аб грамадскіх работах. З пункту гледжання распрацоўшчыкаў гэта абгрунтавана неабходнасцю наяўнасці ў КаАП немаёмаснага спагнання, альтэрнатыўнага арышту. Інакш кажучы, раней выбар быў небагаты: грашова-маёмасныя спагнанні ў выглядзе штрафу ці канфіскацыі або жорсткі, на мяжы з крымінальным пакараннем, арышт.

— Грамадскія работы будуць вызначацца судом і толькі са згоды асобы, якая здзейсніла адміністрацыйнае правапарушэнне, і прадугледжваюць выкананне бясплатных работ на тэрмін ад 8 да 60 гадзін. Від работ будзе вызначацца мясцовымі органамі ўлады ў кожным канкрэтным выпадку, — удакладніў Вадзім Іпатаў.

Дарэчы, такое спагнанне можа быць выкарыстана да асоб, якія нідзе не працуюць ці не могуць аплаціць штраф. Што прапануюць рабіць? Напрыклад, кожны дзень на працягу тыдня па некалькі гадзін прыбіраць вуліцу, добраўпарадкоўваць паркі, скверы і гэтак далей.

Вольга АНУФРЫЕВА.

«БУРАЦІНА» — 45!

Музычную казку «Прыгоды Бураціна», якая з'явілася на «Беларусьфільме» ў 1975 годзе, пакажуць у першы дзень новага года на «Беларусь 3». Дарэчы, тэлепрэм'ера яго адбылася 1-2 студзеня 1976 года. Рэжысёр Леанід Нячаеў зняў тады фільм, які спачатку забаранілі, а потым ён стаў культавым для некалькіх пакаленняў дзяцей. І да сёння застаецца ў ліку любімых дзіцяцых кінастужак.

Знялі двухсерыйны музычны фільм «Прыгоды Бураціна» па матывах казкі Аляксея Талстога «Залаты ключык...». Калі згадаць сюжэт, то там гісторыя распавядае пра шарманшчыка Карла, які атрымлівае ў падарунак «жывое» палена і выразае з яго ляльку — Бураціна з доўгім носам. А каб хлопчык навучыўся сябе прыстойна паводзіць, Карла купляе яму азбуку і адпраўляе вучыцца ў школу. Але па дарозе Бураціна трапляе ў лялечны тэатр Карабаса-Барабаса... Аднак той, ведаючы таямніцу, звязаную з намаляваным на палатне ачагом пакоя таты Карла, адпускае свавольніка і нават дае яму пяць залатых, каб Бураціна і тата Карла бераглі ачаг... Таямніца з часам стае вядомай і драўлянаму хлопчыку, але да гэтага яму даводзіцца прайсці праз мноства прыгод і выпрабаванняў. І дабрыня, смеласць і кемлівасць дапамагаюць Бураціна перамагчы жорсткасць і сквапнасць і знайсці адданых сяброў...

Здымкі кінастужкі праходзілі ў Крыме. Сярод акцёраў — Дзмітрый Іосіфаў, Таццяна Працэнка, Мікалай Грынько, Юрый Кацін-Ярцаў, Алена Санаева, Ралан Быкаў і іншыя. Варта адзначыць, што, напрыклад, выканаўцаў ролі Бураціны і Мальвіны знайшлі амаль выпадкова. Дзмітрыя Іосіфава (Бураціна) рэжысёр заўважыў у падземным пераходзе, а з Таццянай Працэнка (Мальвінай) памочнік рэжысёра пазнаёмілася ў цягніку. Па-рознаму склалася і будучыня юных акцёраў, якія сталі пасля гэтага фільма папулярнымі. Напрыклад, Дзмітрый Іосіфаў пайшоў вучыцца на рэжысёра, а вось Раман Сталкарц (П'еро) стаў урачом-педыятрам. Але ж мы, гледачы, заўсёды будзем памятаць акцёраў дзецьмі і згадваць іх па вядомых песнях і цытатах любімых герояў! Не прапусціце «Прыгоды Бураціна» на «Беларусь 3».

Алена ДРАПКО.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 110

Наступную задачу склаў А. Кірычэнка ***(гл. дыяграму).***

Белыя: Крh5, Фg8, Се5, Сf1, пb2 (5).
Чорныя: Крa1, Лa2 (2).
Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі (вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, «Звязда») або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Малады расійскі шахматыст Аляксей Папоў вядомы не толькі як моцны рашальнік кампазіцый (які ў тым ліку паспяхова выступаў у некалькіх Кубках «Альбіна» ў Мінску), але і як складальнік этюдаў. Вось адна з яго цікавых кампазіцый.

Белыя: Крf1, Лh1, пп. a6, c2, c3, f2 (6).
Чорныя: Крb8, пп. b2, c4, f3, f4 (5).
Нічыя.

Рашае 1. Крe1! b1Ф+ 2. Крd2 Фa2! 3. a7+! Крb7! 4. Лh8! Кр:a7 5. Лh1 Крb7 6. Лa1! Фb2! 7. Лb1 Ф:b1 — пат.

І яшчэ этюд таго ж аўтара.

Белыя: Крh6, Лb8, пп. a3, a5, e5, g5 (6).
Чорныя: Крa4, Лd5, Лf5, пп. g6, h7 (5).
Нічыя.

Да мэты вядзе 1. a6! Лa5 2. e6 Лfe5 3. e7! Л:e7 4. a7 Лa:a7 5. Лb7! Крa5! 6. a4! Крa6 7. a5 Лe8 8. Лb6+ Кр:a5 9. Лb5+! Крa4! 10. Лb4+ Крa3 11. Лb3+ Крa2 12. Лb2+ Крa1 13. Лb1+ Кр:b1 — пат; 7...Лe6 8. Лe7! Лd6! 9. Лd7 Лc6 10. Лc7 Лa:c7 — пат.

* * *

Сёлетні чэмпіянат свету па хуткіх шахматах сярод юнакоў і дзяўчат праходзіць у анлайн-фармаце. У еўрапейскім кантынентальным адборачным турніры да першынства свету прынялі ўдзел 10 юных беларусаў ва ўзросце ад 10 да 18 гадоў. Найлепшы вынік паказаў Дзяніс Лазавік: першае месца сярод юнакоў да 14 гадоў і выхад у наступны этап. Ксенія Норман заняла сёмае месца сярод дзяўчат да 14 гадоў, Ксенія Зеянцова — дзявятае да 16 гадоў. У юнакоў Вячаслаў Зарубіцкі — дванаццаты ў групе да 18 гадоў, Арцём Стрыбук — пятнаццаты ў групе да 14 гадоў.

У турніры на сайце chess.com (61 удзельнік) Кірыл Ступак падзяліў 5—9-е месцы.

* * *

Аднавіліся анлайн-турніры наймацнейшых шахматыстаў. У чарговым такім спаборніцтве чэмпіён свету Магнус Карлсен заняў другое месца, саступіўшы ў фінале амерыканскаму гросмайстру Уэслі Со. Вось дзве партыі са згаданага турніру.

Алірэза Фірузджа — Лявон Аранян. 1. Kf3 d5 2. g3 Kf6 3. Cg2 g6 4. c4 dc 5. Фa4+ Kfd7 6. Ф:c4 Cg7 7. Kc3 Kb6 8. Фh4 h6 9. d4 Kc6 10. 0-0 Cf5 11. g4 Cd7 12. Лd1 e5 13. Фg3 ed 14. Kb5 0-0 15. K:c7 Лc8 16. Kb5 a6 17. Kb:d4 K:d4 18. K:d4 Ca4 19. b3 C:d4 20. C:h6 Фf6 21. g5 Фh8 22. Лac1 Cd7 23. Фd6 Cg4 24. Л:c8 Л:c8 25. Л:d4 Лc1+ 26. Лd1 Фa1 27. Фf8+, 1:0.

Хікару Накамура — Алірэза Фірузджа. 1. e4 c6 2. d4 d5 3. Kc3 de 4. K:e4 Cf5 5. Kg3 Cg6 6. h4 h6 7. Kf3 Kd7 8. h5 Ch7 9. Cd3 C:d3 10. Ф:d3 e6 11. Cf4 Фa5+ 12. Cd2 Cb4 13. c3 Ce7 14. c4 Фb6 15. Cc3 Kgf6 16. Ke5 Лd8 17. Фe2 Cb4 18. 0-0 C:c3 19. bc 0-0 20. Лab1 Фc7 21. f4 c5 22. Фf3 Kb6 23. Лfd1 Kfd7 24. Ke4 cd 25. cd f5 26. Kc5 K:c5 27. dc Ф:c5+ 28. Крh2 Фc7 29. a4 Л:d1 30. Л:d1 Лd8 31. Ф:b7 Ф:b7 32. Л:d8+ Крh7 33. Kg6 Фc8 34. Л:c8 K:c8 35. c5 Крg8 36. Крg3 Kpf7 37. Крf3 Крe8 38. Крe3 Крd7 39. Крd4 a6 40. Крe5 Крc6 41. Кр:e6 Кр:c5 42. Крf7 Крb4 43. Кр:g7, 1:0.

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1. Крa4, а пасля перастаноўкі фігур: 1. Крb5! Першыя правільна адказалі Ігар Ананіч, Уладзімір Ізотаў, Сяргей Цяльпук, Віктар Жук.

Вадзім ЖЫЛКО.

Слова — чытачам

«Першае інтэрв'ю, якое я зрабіў, — гутарка з Рыгорам Барадуліным для «Звязды»

Віктар ШНІП, паэт, галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура»:

— Газету «Звязда» чытаю ўжо пяцьдзясят гадоў. Яе ўсё жыццё выпісвалі мае бацькі ў Пугачах. Маці даярка, а бацька пастух. Па сённяшні дзень памятаю публікацыю верша Пятра Прыходзькі да 60-годдзя з дня нараджэння Валянціна Таўлая. Гэта быў 1974 год. Верш пачынаўся так: «Трыццаць тры, як гэта мала для паэта-змагара...» Радкі мяне вельмі ўразілі. Я ўжо тады рыфмаваў. І, прачытаўшы твор Пятра Прыходзькі, сам захацеў паслаць свае вершы ў «Звязду». І паслаў. І атрымаў з рэдакцыі цёплы ліст ад Міколы Гамолкі і Алеся Траяноўскага, які натхніў мяне на стварэнне новых вершаў.

Першае інтэрв'ю, якое я зрабіў у сваім жыцці, — гутарка з Рыгорам Барадуліным, надрукаваная ў «Звяздзе». Мне было 23. Сем гадоў да вучобы ў Літінстытуце я амаль нідзе не працаваў. Пісаў вершы, хадзіў па рэдакцыях. Жыў за атрыманыя ганарары. Часта карміўся ў сяброў і недзе пару разоў на месяц — у Рыгора Барадуліна. У маі 1983 года я прыйшоў у рэдакцыю газеты «Звязда», а там у аддзеле культуры сядзіць мой сябра Уладзімір Марук. Валодзя, ведаючы, што я перабіваюся з капейкі на капейку, прапанаваў мне зрабіць для газеты з кім-небудзь інтэрв'ю, бо вершы часта друкаваць яны не могуць. «А можна я з Рыгорам Барадуліным пагавару?» — нясмела запытаў я. «Пагавары, калі Рыгор Іванавіч пагодзіцца!» — адказаў Марук. У той жа дзень я паведаміў свайму Настаўніку, што хачу зрабіць з ім гутарку для «Звязды». Я раней інтэрв'ю ні з кім не рабіў, аб чым пры сустрэчы прызнаўся Барадуліну. Яго жонка Валянціна Міхайлаўна, пакарміўшы мяне, пакінула нас на кухні. Рыгор Іванавіч прынёс мне паперу і аўтаручку. Пасадзіў бліжэй да святла і пачаў дыктаваць пытанні да сябе і свае адказы. Гаварылі гадзіны дзве. І як вынік — 11 чэрвеня 1983 года ў «Звяздзе» з'явілася маё інтэрв'ю з Барадуліным «Сваё слова — ад маці». Праз месяц мне выдалі ганарар, і я адразу паехаў да Рыгора Іванавіча, каб палавіну грошай аддаць яму. Даведаўшыся, чаго я прыйшоў, Барадулін рассмяяўся і, не ўзяўшы грошай, сказаў: «Ты іх чэсна зарабіў!»...

Шмат дарагіх успамінаў звязана ў мяне з любімай газетай... Калі вучыўся ў Маскве ў Літаратурным інстытуце, я выпісваў «Звязду», якую кожны дзень чакаў як сустрэчу з родным чалавекам. І цяпер, выпісваючы «Звязду» і чытаючы яе, радуюся, што тут на роднай мове друкуецца шмат цікавых і карысных матэрыялаў па гісторыі нашай краіны, па краязнаўстве, па мастацтве, па літаратуры, пра наша сённяшняе жыццё. Я ўжо не гавару пра аператыўную журналісцкую інфармацыю, аб'ектыўную і шчырую. Сённяшняя «Звязда» — гэта люстэрка жыцця нашай краіны — Рэспублікі Беларусь.

Я чытаю «Звязду» і буду чытаць, бо люблю яе, як любілі мае бацькі ўсё сваё жыццё.

Налета з любімай газетай!

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2021 года, — у падарунак чатыры календары — ✓маляўнічы насценны, ✓рэлігійны, ✓народны і ✓месяцовы

«Звязда»: цёплыя словы, цёплыя рэчы»

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на I квартал або I паўгоддзе 2021 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 12 студзеня 2021 года ў рэдакцыю на адрас: вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск.

Сярод падпісчыкаў 15 студзеня 2021 года будуць разыграны 7 жаночых камізэлек і суперпрыз — маслены радыятар General Climate. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 25 студзеня 2021 года.

6.10 Формы жыцця. Лясныя гісторыі (6+).
6.20 Беларусы (6+).
7.15 «Здароўе» (12+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.35 Сфера інтарэсаў.
9.00 «Навукаманія» (6+).
9.35, 22.00 «НЗ.by».
10.20 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).
11.10 Серыял «Каманда» (16+).
12.05, 13.45 Баявік «Марскія д'яблы. Рубяжы Радзімы» (16+).
13.20 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
14.50 Пракурорская праверка (16+).
16.25 Гісторыі выратавання (12+).
16.55 «ДНК» (16+).
18.05, 19.50, 21.35 Серыял «Пёс» (16+).
21.00 «Зарабіў на заначцы!» (розыгрыш)
22.25 Серыял «Першы аддзел» (16+).
23.50 Зламаць стэрэатыпы (12+).
0.10 «Справа ўрачоў» (16+).

8 канал

7.00, 15.50, 17.40, 21.10, 2.00 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 «Мультпарад». «Скубі-Ду і адгадай хто» (6+).
7.30, 15.55, 20.50 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Серыял «Зорны шлях» (12+).
9.00 Серыял «Шэрлак» (12+).
10.30 «Дзеці пра ежу» (12+).
11.00 «Мультпарад» (6+).
11.40, 16.50 Серыял «Дзённікі вампіра» (16+).
12.25 Трылер «Чужы» (16+).
15.00 Серыял «Неўтаймоўны валадар» (16+).
16.00 «Мультпарад». «Трое з Прастаквашына» (6+).
17.45 Камедыя «Навагодні анёл» (12+).
19.30 «Б'юці-дзень» (12+).
20.00 Серыял «Дзіўныя гісторыі» (16+).
20.55 «Вечарніца» (6+).
21.15 Трылер «Аватар» (12+).
0.15 Меладрама «Зачараваная» (6+).

ВТБ

6.05 «Лаві момант» (16+).
7.10 «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
9.00 «Уральскія пельмені». Бітва фужэраў (16+).
14.40 Серыял «Радкам» (16+).
0.00 «Уральскія пельмені» (16+).
5.00 «6 кадраў».

Культура

6.30, 1.55 «Песня не развітваецца... 1974».
7.25 «Прывітанне, Я ваша цётка!» Маст. фільм [СЦ].
9.05 «Дванаццаць месяцаў». М/ф.
10.05 «Тайна Снежнай каралевы (казка пра казку)». Маст. фільм [СЦ].
12.20, 1.00 «Падарожжа да выратавальных берагоў Мексікі». Дак. фільм [СЦ].
13.15 Навагодні канцэрт Венскага філарманічнага аркестра — 2021. Дырыжор Рыкарда Муці. Прамая трансляцыя з Вены.
15.50 Прыгожая планета.
16.05 90 гадоў з дня нараджэння Анатоля Рамашына. «Чалавек у капелюшы». Дак. фільм [СЦ].
16.50 Міжнародны фестываль цыркавога мастацтва ў Монтэ-Карла.
18.50 «Песня не развітваецца...» Выбраныя старонкі «Песні года».
20.45 «Прыяцель Джоі». Маст. фільм.
22.30 Балет Аляксандра Экмана «Эскапіст».
0.00 Чучо Вальдэс. Канцэрт на Мальце.
2.45 «Жыў-быў сабака». Мультфільм для дарослых.

Настальгія

6.00 «Яловая субмарына». «Машина времени» (16+).
6.45, 8.15, 9.45, 11.00, 15.45, 17.15, 19.15, 20.45, 21.45, 23.30, 1.40, 2.45, 3.45, 5.00 Музычная настальгія (12+).
6.55 «Вакол смеху». «Атэлье гумару». 1983 год (12+).
8.30 Фільм-канцэрт «Рытм, рытм, рытм» (12+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР».
12.00 Навагодні фільм-канцэрт «Выкраданне» (12+).
16.00 «Музычная гавань» (16+).
18.00 «Да і пасля...» Навагодні выпуск. 2008 год (16+).
19.30 «Тэатральныя сустрэчы». «Навагодні выпуск» (12+).
22.00 «Народжаныя ў СССР». Найлепшае (12+).
23.10 Маст. фільм «Глыбокія сваякі» (16+).
0.00 «Кінапанарама». 1981 год (16+).
1.55 Фільм-канцэрт «З дазволу праграмы «Бенефіс» (12+).

EuroSport 1

0.35, 10.35, 15.25, 19.05, 21.30 Скачкі на лыжах з трамплінаў. Турнэ 4 трамплінаў (12+).
1.30 Алімпійскія гульні. Тэлечасопіс «Зала славы». Рыа-2016 (12+).
2.30 Алімпійскія гульні. Тэлечасопіс «Зала славы». Пхёнчхан-2018 (12+).
3.30 Веласпорт. Чэмпіянат свету (12+).
5.00, 9.00 Снукер. UK Championship (6+).
7.00 Веласпорт. Льеж — Бастонь — Льеж (12+).
11.45 Лыжныя гонкі. Кубак свету (6+).
13.35, 17.45, 20.00, 23.05 Лыжныя гонкі. «Тур дэ Скі» (6+)

Кінакамедыя

1.00 Парк культуры і адпачынку (18+).
3.20 Дапамажыце стаць бацькам (16+).

5.00 Пачні спачатку (16+).
6.45 Чаго хоча Джульета (16+).
8.30 Завадатары (16+).
10.10 Крутая Джорджыя (16+).
12.05 Выпадковы шпіён (12+).

13.40 Астэрыкс і Абелікс супраць Цэзара (12+).
15.35 Астэрыкс і Абелікс: Місія «Клеапатра» (12+).
17.35 Самы лепшы дзень (16+).
19.30 Вельмі небяспечная штучка (16+).

21.00 Таўстун на рынгу (12+).
22.50 Як займацца каханнем па-англійску (18+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
9.00 «Паглядзім» (12+).
9.30 «Прадаецца дача». Меладрама (12+).
11.10 «Снежная пяцёрка». Анімацыйны фільм (0+).
12.45 «10 самых» (16+).
13.50 «Адзін дома». Маст. фільм (0+).
15.45 «Адзін дома-2». Маст. фільм (0+).
17.50 «Адзін дома-3». Маст. фільм (12+).
19.40, 1.25 «Чалавек-невідзімка» (16+).
20.45 «Дзённік Брыджыт Джонс». Маст. фільм (16+).
22.35 «Дзённік Брыджыт Джонс-2». Маст. фільм (16+).
0.30 «10 самых» (16+).
2.20 «Знесеныя ветрам». Маст. фільм (12+).

ТВ1000 ТБ1000

5.00 Смурфікі-2 (6+).
7.00, 16.30 Валяр'ян і горад тысячы планет (16+).
9.25 Добрай раніцы (16+).
11.15 Неверагоднае падарожжа містэра Співета (6+).
13.05 Цар скарпіёнаў (12+).
14.40 Мумія: Грабніца Імператара Цмокаў (16+).
19.00 Пяты элемент (16+).

21.15 Людзі ў чорным (12+).
22.55 Людзі ў чорным-2 (12+).
0.25 Людзі ў чорным-3 (12+).
2.25 Робін Гуд: Прынц зладзеяў (12+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.50 Наша Russia. Яйкі Лёсы (16+).
7.15 Пяць нявест (16+).
9.10 Чэмпіёны (6+).
10.50 Чэмпіёны: Хутчэй. Вышэй. Мацней (6+).
12.35 Снежная каралева-3. Агонь і лёд (6+).
14.00 Снежная Каралева: Залюстроўе (6+).
15.30 Пра што гавораць мужчыны (16+).
17.10 Пра што яшчэ гавораць мужчыны (16+).
19.00 Дзень радыё (16+).
20.50 Дзень выбараў-2 (12+).
22.45 Самы лепшы дзень (16+).
0.35 Аб чым маўчаць дзяўчаты (12+).
2.00 Вышэй за неба (16+).
3.50 Каралева (12+).

National Geographic

6.00 Аўта-SOS (16+).
10.05 80-я: дзесяцігоддзе, якое стварыла нас (16+).
15.10 2000-я: час, калі мы ўбачылі ўсё (16+).
17.25, 5.40 Гісторыя дзесяцігоддзяў (16+).
1.05 Расследаванні авіякатастроф (16+).

Discovery

8.00 Як гэта ўладкавана? (16+).
8.48 Як гэта зроблена? (12+).
9.36 Рэактыўныя Каляды (12+).
12.00 Вялікае і Рычард Хаманд (12+).
12.48 Паляўнічыя на старызну (12+).
14.24 Эд Стафард: гульня на вылет (16+).
16.00 Залатая ліханка: закінуты прыіск Дэйва Турына (16+).
17.36 Сталёвыя хлопцы (12+).
20.48 У ГАС на прапампоўку (12+).
0.00 Як уладкаваны Сусвет (12+).
1.42 Самагоншчыкі (18+).
3.24 Дальнабойшчык у В'етнаме (12+).
5.42 Бітвы скарбашукальнікаў (12+).

Беларусь 1

6.00 Меладрама «Прыстойная сям'я здасць пакой». 1-я і 2-я серыі (12+).
9.10 Меладрама «Разводу не будзе». 1-я і 2-я серыі (16+).
10.50 Галоўная ёлка краіны. Навагоднее дабрачыннае свята для дзяцей з удзелам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі.
12.00, 15.00 Навіны.
12.10 Меладрама «Ідучы за сэрцам». 1—4-я серыі (16+).
15.10 Навагодні маладзёжны баль у Палацы Незалежнасці.
16.10 Меладрама «Як сустрэць свята не па-дзіцячы» (16+).
17.45 Меладрама «Дзеда Мароза не бывае». 1—4-я серыі (12+).
21.00 Панарама.
21.40 Меладрама «Проста раман». 1—4-я серыі (16+).

Беларусь 2

7.10 Камедыя «SOS, Дзед Мароз, або Усё збудзецца!» (12+)
8.35 Анімацыйны фільм «Добры дыназаўр» (12+).
10.00, 19.40 Тэлебарометр.
10.05 Камедыя «Адзін дома» (12+).
11.45 Камедыя «Адзін дома-2: закінуты ў Нью- Ёрку» (12+).
13.40 Камедыя «Адзін дома-3» (12+).
15.20 Прыгоды «Ледніковы перыяд» (12+).
16.40 Прыгоды «Ледніковы перыяд-2: глабальнае пацяпленне» (12+).
18.10 Прыгоды «Ледніковы перыяд-3: эра дыназаўраў» (12+).
19.45 Прыгоды «Ледніковы перыяд-4: кантынентальны дрэйф» (12+).
21.10 Спортлато 5 з 36, КЕНА.
21.15 Прыгоды «Ледніковы перыяд-5: сутыкненне непазбежнае» (6+).
22.45 Фільм-фэнтэзі «Прыгажуня і Пачвара» (12+).

Беларусь 3

7.40 «Варвара-краса — Доўгая каса». Маст. фільм (6+).
9.05, 20.00 «Сваімі словамі».
9.40 «Чарадзеі». Маст. фільм (6+).
12.15 «Культурны рэпартаж». Каляды.
12.30 «Легенды кіно». Рына Зялёная (12+).
13.10 «Прыгоды Бураціна». Маст. фільм (6+) [СЦ].
15.30 П. І. Чайкоўскі. «Шчаўкунок». Балет Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь.
17.15 «Марозка». Маст. фільм (6+).
18.35 Навагодні «Блакітны агеньчык».
19.30 «Ваша лато», «Пяцёрачка».
20.40 «Калыханка» (0+).
21.05 «Зігзаг удачы». Маст. фільм (12+) [СЦ].
22.30 «Вяселле ў Малінаўцы». Маст. фільм (12+) [СЦ].

Беларусь 5

7.50 Футбол. Чэмпіянат Англіі.
9.45 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
10.40 Біятлон. Калядная гонка — 2020. Масстарт. Мужчыны. Жанчыны.
11.35 Біятлон. Калядная гонка — 2020. Гонка пераследу. Мужчыны. Жанчыны.
12.35 Агнявы рубеж.
13.05 Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Нафтахімік» (Ніжнякамск).
15.00 Вось гэта спорт!
15.20 Хакей. Маладзёжны чэмпіянат свету (U-20). Канада — Фінляндыя.
17.15 Хакей для ўсіх.
17.45 Хакей. Маладзёжны чэмпіянат свету (U-20). Швецыя — ЗША.
19.40, 22.30 Спартыўныя бальныя танцы. Кубак мэра Мінска.
21.30 Авертайм.
22.00 Свет англійскай прэм'ер-лігі. Відэачасопіс.

АНТ

6.00 «Навагодні каляндар» (0+).
7.05 Фільм «Стары Хатабыч» (6+).
8.30 Кіно ў колеры. «Папялушка» (6+).
10.40 Фільм «Жаданне» (16+).
12.30 Фільм «Вузкі мост» (16+).
16.00, 20.30 Нашы навіны (без спорту).
16.20 Фільм «Асаблівасці нацыянальнага палявання ў зімовы перыяд» (16+).
17.45 «Лепш за ўсіх!» Навагодні выпуск (0+).
21.00 «Клуб Вясёлых і Знаходлівых». Вышэйшая ліга. Фінал (16+).
23.20 «Дыскатэка 80-х» (16+)

СТБ

6.00 Музычны марафон «Легенды Рэтра FM» (16+).
9.30 «Ёлкі кудлатыя». Камедыя (0+).
11.00 «Легенды СССР» (16+).
13.30, 16.30, 19.30 Навіны «24 гадзіны».
13.40, 16.40, 0.55 «Легенды СССР» (16+).
17.45 «Ёлкі-2». Камедыя (12+).
20.00 «Ёлкі-3». Камедыя (12+).
21.45 Музычны марафон «Легенды Рэтра FM» (16+).
0.55 «Легенды СССР» (16+).

МІР

5.00, 4.45 Мультфільмы.
8.10 Маст. фільм «Каменная кветка» [СЦ] (6+).
10.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
10.10 Маст. фільм «Снежная каралева» [СЦ] (6+).
12.00 Маст. фільм «Вучань лекара» (6+).
13.30 Маст. фільм «Садко» [СЦ] (6+).
15.20 Маст. фільм «Як Іванка-дурачок па цуд хадзіў» (6+).
17.20 Маст. фільм «Казка пра страчаны час» [СЦ] (6+).
19.15 Маст. фільм «Танцор дыска» (12+).
22.15 Маст. фільм «Танцуй, танцуй» (12+).
1.05 Маст. фільм «Звычайны цуд» [СЦ] (12+).
3.20 Дыскатэка «Аўтарадыё» (12+).

РТР—Беларусь

7.00 Маст. фільм «Лятучая мыш».
9.35 Маст. фільм «Карнавал».
12.15 Камедыя «Паласаты рэйс» (12+).
13.50 Камедыя «Тры плюс два» (12+).
15.30 «Песня года».
17.50 «Гумар года» (16+).
20.00 Весткі.
21.05 Маст. фільм «Супер-Бабровы. Народныя мсціўцы» (12+).
22.30 Маст. фільм «Запаведнік» (12+).
0.20 Маст. фільм «Адэскі параход» (12+).

НТБ—Беларусь

5.30 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).
7.00 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў» (16+).
7.50 Terra incognita. Беларусь невядомая (6+).
8.20 «Здароўе» (12+).
9.00 Баявік «Адэсіт» (16+).
12.25 Меладрама «Навагодні шлюб» (12+).
14.00 «Дзіцячая Новая хваля — 2020» (0+).
15.35 Серыял «Пёс» (16+).
21.30 «Суперстар! Вяртанне» (16+).
23.40 Камедыя «У зоне доступу кахання» (16+).
1.15 «Кватэрнік НТБ у Маргуліса». Гоша Куценка (16+).

8 канал

7.00, 21.10, 1.40 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 «Мультпарад». «Кароль Леў» (6+).
9.05, 20.50 «Прыколы 13-й школы».
9.10 Серыял «Зорны шлях» (12+).
10.10 Меладрама «Ідзі па закліку сэрца». 1—4-я серыі (12+).
13.20 Камедыя «Ёлкі». 1—2-я серыі (12+).
14.50 «Мультпарад». «Прастаквашына» (0+).
16.20 Серыял «Дзённікі вампіра» (16+).
17.05 Прыгоды «Дзед Мароз і бітва Магаў» (6+).
19.10 «Надвор'е».
19.15 Серыял «Шэрлак» (12+).
20.55 «Вечарніца».
21.15 Трылер «Чужыя» (16+).
23.15 Трылер «Зорныя войны» (16+).

ВТБ

6.05 «Дурні і дарогі» (16+).
7.00, 14.00 «Раніца з гумарам» (16+).
10.35 Серыял «Кухня» (16+).
12.10, 23.15 «КВЗ. Панашаму» (16+).
15.50, 3.15 Серыял «Лонданград» (16+).
16.55 «Уральскія пельмені» (16+).
18.00 Серыял «Кухня» (16+).
19.35 Серыял «Нагіеў на каранціне» (16+).
21.30 Фантастыка «Хэнкок» (16+).
0.00 Серыял «Вы ўсе мяне прыводзіце ў шаленства» (16+).
1.00 «Супермамачка» (16+).
2.50 Серыял «Татавы дочкі».
4.05 «Адна за ўсіх» (16+).
4.45 «6 кадраў».

Культура

6.30, 7.00, 10.00, 15.00, 19.30, 23.45 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...» Масква хлебасольная.
7.05, 2.05 Краіна птушак. «Крумкачы вялікага горада». Дак. фільм [СЦ].
8.00 «Першыя ў свеце». Дак. серыял.
8.20 Легенды сусветнага кіно. Фрэнк Сінатра.
8.50, 15.20 «Людзі і манекены». Маст. фільм [СЦ].
10.15 «Назіральнік».
11.10, 0.05 XX стагоддзе. «Песня-78. Фінал».
13.15 Да 90-годдзя з дня нараджэння Анатоля Кузняцова. Астравы [СЦ].
13.55 «Усходні дантыст». Маст. фільм [СЦ].
15.05 Навіны. Падрабязна. Кіно.
16.30 Анне-Сафі Мутэр, Джон Уільямс і Венскі філарманічны аркестр. Музыка да кінафільмаў.
18.45 «Найвялікшае шоу на зямлі. Сальвадор Далі».
19.45 Галоўная роля.
20.00 Усерасійскі адкрыты тэлевізійны конкурс юных талентаў «Сіняя птушка». Фінал.
22.20 «Зігзаг удачы». Маст. фільм [СЦ].

Настальгія

6.00 «СевАлогія». «Кватэрная культура» (18+).
7.05 Маст. фільм «Наша дача» (16+).
8.30 «Ранішняя пошта». 1987 год (12+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
9.45, 11.00, 13.40, 14.45, 15.45, 17.00, 18.45, 20.15, 21.45, 23.00, 3.45, 5.40 Музычная настальгія (12+).
10.00, 16.00, 22.00 «Народжаныя ў СССР».
12.00 «Кінапанарама». 1981 год (16+).
13.55 Фільм-канцэрт «З дазволу праграмы «Бенефіс» (12+).
18.00 «Яловая субмарына». «Машина времени» (16+).
18.55 «Вакол смеху». «Атэлье гумару». 1983 год (12+).
20.30 Фільм-канцэрт «Рытм, рытм, рытм» (12+).
0.00 «Народжаныя ў СССР». Найлепшае (16+).
1.05 «Па той бок рампы» (12+).
1.50 «Мы Вас любім!» Канцэрт гурта «Воскресение» (12+).
4.00 «Пад знакам задыяка. Казярог» (18+).

EuroSport 1

0.30, 17.00, 20.30 Скачкі на лыжах з трамплінa. Турнэ 4 трамплінаў (12+).
1.00 Ралі-рэйд. Дакар (12+).
1.30 Алімпійскія гульні. Тэлечасопіс «Зала славы». Сідней-2000 (12+).
2.30 Алімпійскія гульні. Тэлечасопіс «Зала славы». Афіны-2004 (12+).
3.30 Веласпорт. «Тур Ламбардыі» (12+).
5.00 Снукер. English Open. Фінал (6+).
7.00 Веласпорт. Чэмпіянат свету (12+).
9.00 Футбол. Дак. фільм Amando A Maradona (6+).
10.30 Тэніс. Australian Open. Агляд (6+).
11.30 Тэніс. US Open. Агляд (6+).
12.30 Тэніс. «Ралан Гарос». Агляд (6+).
13.30, 19.05 Горныя лыжы. Кубак свету (12+).
22.00 Тэніс. «Ралан Гарос» (6+).

Кінакамедыя

1.35 Стажор (16+).
3.25 Завадатары (16+).
5.00 Аферысты Дзік і Джэйн (12+).
6.40 Прыгажунчык са стажам (16+).
8.25 Дапамажыце стаць бацькам (16+).
10.10 Парк культуры і адпачынку (18+).
12.10 Шэф (12+).
13.50 Чаго хоча Джульета (16+).
15.40 Крутая Джорджыя (16+).
17.45 Выпадковы шпіён (12+).
19.30 Шпіён па суседстве (12+).
21.15 Прасцячка (16+).

23.15 Дастаць карантышку (16+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
8.45 «Перыскоп» (16+).
9.10, 15.35, 4.30 «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
10.15, 17.20 «Старац» (16+).
10.55, 18.30, 3.35 «Слепая» (16+).
12.05, 19.40 «Варажбітка» (12+).
13.15 «Містычныя гісторыі» (12+).
14.20 «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
16.40 «Знакі лёсу» (16+).
20.55 «Косці». Серыял (16+).
22.45 «Грым». Серыял (16+).
23.45 «Глядзі сам» (16+).
0.00 «10 самых» (16+).
0.35 «Лінія абароны» (16+).
1.05 Маст. фільм «Рэальнае каханне» (16+).

ТБ1000

5.00 Дзень сурка (12+).
6.45 Неверагоднае падарожжа містара Співета (6+).
8.35 Воблачны атлас (16+).
11.35 Паляўнічыя на прывідаў (12+).
13.25 Паляўнічыя на прывідаў-2 (12+).
15.20 Аднакласнікі (16+).
17.10 Аднакласнікі-2 (16+).
19.00 Мумія (12+).
21.10 Мумія вяртаецца (12+).
23.30 Белфегар — прывід Луўра (12+).
1.15 Прадчуванне (16+).
3.05 Забытае (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.45 Без мяне (16+).
8.30 Аб чым маўчаць дзяўчаты (12+).
10.10 Каханне з абмежаваннямі (16+).
12.05 Вышэй за неба (16+).
14.00 Тарыф «Навагодні» (16+).
15.30 Наша Russia. Яйкі Лёсу (16+).
17.05 Млечны шлях (12+).
19.00 Чэмпіёны (6+).
20.45 Чэмпіёны: Хутчэй. Вышэй. Мацней (6+).
22.40 Адрыў (16+).
0.05 На раёне (16+).
1.50 Брат (16+).
3.25 Брат-2 (16+).

National Geographic

6.45, 13.30, 1.10 АўтаSOS (16+).
7.30, 12.40, 14.15, 16.50, 2.45 Інстынкт выжывання (16+).
8.25 Ледзяная дарога (16+).
9.10 Мегамосты (16+).
10.05 У дзікай прыродзе з Беарам Грылсам (16+).
11.00, 20.10 Фабрыка ежы (16+).
11.50 Дзікі тунец (16+).
15.10, 17.40, 0.25 Расследаванні авіякатастроф (16+).
16.00 Мяжа (16+).
18.30 Сакрэтныя матэрыялы старажытнасці (16+).
19.20 Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
21.00, 3.35 Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
21.50 У пошуках Амеліі (16+).
23.30 Ліхтугі за мяжой (16+).
4.20 Найцяжэйшы ў свеце рамонт (16+).
5.10 Асушыць акіян (16+).

Discovery

8.00, 2.59 Чыгунка Аўстраліі (16+).
8.45, 18.03, 23.09 Гаражнае золата (12+).
9.35, 17.12, 22.18 Круты цюнінг (12+).
10.25, 20.36, 6.05 Бітвы за кантэйнеры (12+).
11.15 Як пабудаваць... што заўгодна (12+).
12.06, 19.45, 4.33 Махінатары (12+).
12.57 Узрываючы гісторыю (12+).
13.48, 7.14 Рэактыўныя Каляды (12+).
14.39, 0.00 Голыя і напалоханыя (16+).
15.30, 21.27 Як гэта ўладкавана? (12+)
16.21, 2.08 Музейныя загадкі (12+).
18.54 Ратавальнікі-цяжкавагавікі (16+).
1.17, 6.28 Выжыць разам (16+).
3.47 Экспедыцыя на край зямлі (12+).
5.19 Як гэта ўладкавана: аўтамабілі мары (12+).

чацвер, 31 снежня ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10 «Зона Х». Крымінальная хроніка (16+).
9.10 Меладрама «Давай развядзёмся!» (16+)
10.55, 12.10, 13.05, 15.25 Меладрама «Мелодыя на два галасы» (16+).
14.05 «Здорава здаровым быць!» (6+) [СЦ]
15.10 Навіны рэгіёна.
16.20 «Маршрут пабудаваны». Навагодні выпуск.
17.00 Меладрама «Ёлка на мільён». 1—4-я серыі (12+).
21.00 Панарама.
21.45, 0.05 «Новы год на Беларусь 1».
23.50 Навагодняе віншаванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі.
1.15 Меладрама «Як сустрэць свята не па-дзіцячы» (16+).
2.45 Меладрама «Мелодыя на два галасы». 1-я і 2-я серыі (16+).

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 16.30 Тэлебарометр.
9.05 Серыял «Сляпая» (16+).
10.05 «Паненка-сялянка» (16+).
11.10 Анімацыя для ўсёй сям'і «Халоднае сэрца» (0+).
12.45 Меладрама «Зімовая казка, або Каралева, якая страціла імя» 12+).
14.50 Серыял «Анатомія страсці» (16+).
15.40 «Нічога сабе ньюз» (12+).
15.45 «ПІН_КОД» (12+).
16.35 «Арол і рэшка. Марскі сезон» (16+).
17.25 Камедыя «SOS, Дзед Мароз, або Усё збудзецца!» (12+)
19.00 Фільм-фэнтэзі «Прыгажуня і Пачвара» (12+).
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНА.
21.30 «Вежа» (12+).
22.20 Меладрама «З Новым годам, мамы!» (12+)
23.50 Навагодняе віншаванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі.
0.05 Прыгоды «Ледніковы перыяд» (12+).
1.20 Прыгоды «Ледніковы перыяд-2: глабальнае пацяпленне» (12+).
2.50 Прыгоды «Ледніковы перыяд-3: эра дыназаўраў» (12+).
4.15 Прыгоды «Ледніковы перыяд-4: кантынентальны дрэйф» (12+).
5.40 Прыгоды «Ледніковы перыяд-5: сутыкненне непазбежнае» (6+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35 «Беларуская кухня». Суп з трусяціны з клёцкамі.
8.05, 12.00 Навіны культуры.
8.25, 15.50 «Вялікі перапынак». Маст. фільм. Закл. серыі (12+).
10.40 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
11.05 «Кадры жыцця». Юрый Ялхоў.
12.20 «Беларуская кухня». Мяса пад белым соусам.
12.50 «Балада аб доблесным рыцары Айвенга». Маст. фільм (12+).
14.20 «Карагод у Новы год».
18.10 «Сваімі словамі».
18.50 «Сірата казанская». Маст. фільм (12+).
20.10 «Беларуская кухня». Качка з мёдам.
20.40 «Калыханка» (0+).
21.05 «Марозка». Маст. фільм (6+).
22.30 «Навагодні маскарад». Святочны эфір з Вялікага тэатра Беларусі.
23.50 Навагодняе віншаванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі.
0.05 «Чарадзеі». Маст. фільм (6+).
2.40 Новы год у класічным стылі.
3.35 «Дзень добры, я ваша цётка!» Маст. фільм (12+) [СЦ].
5.15 І. Штраус. «Казкі венскага лесу». Канцэрт сімфанічнага аркестра Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра.
6.45 «Калі запальваюцца ёлкі». М/ф (0+).
7.05 «Хітрая варона». М/ф (0+).
7.15 «Дзядзечка Ау». М/ф (0+).

Беларусь 5

5.30, 11.00 Хакей. Маладзёжны чэмпіянат свету (U-20). Расія — Швецыя.
7.50 Кіберспорт. FIFA-2020. «Кубак Пятага канала».
10.30 Хакей для ўсіх.
13.00, 16.55 Спорт-цэнтр.
13.10 Тэніс. WTA. Доха. Фінал. А. Сабаленка — П. Квітава.
14.55 Хакей. КХЛ. ЦСКА — «Дынама-Мінск».
17.05 Тэніс. Кубак Федэрацый. Кваліфікацыйны раўнд. Нідэрланды — Беларусь.
21.15, 4.45 Вынікі года.
22.00 Біятлон. Кубак свету. Хохфільцэн. Спрынт. Жанчыны.
23.50 Навагодняе віншаванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі.
0.05 Тэніс. WTA. Астрава. Фінал. А. Сабаленка — В. Азаранка.
1.45, 4.25 Вось гэта спорт!
2.00 Хакей. Маладзёжны чэмпіянат свету (U-20). Канада — Фінляндыя.
5.30 Хакей. Маладзёжны чэмпіянат свету (U-20). Швецыя — ЗША.

АНТ

6.00, 7.15, 8.15 «Наша раніца».
7.00 [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.00** Нашы навіны.
7.10, 8.10 «Трывожная кнопка» (16+).
09.10 «Тэорыя змовы» (16+).
10.00 «Жыць здорава!» Навагодні выпуск (16+).
11.15 «Модны прыгавор». Навагодні выпуск (6+).
12.20, 13.15, 16.20 Фільм «40+, або Геаметрыя пачуццяў» (16+).
16.50, 18.20 Фільм «Золушка» (16+).
18.50 «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
18.55 Да 45-годдзя фільма. «Іронія лёсу. З каханымі не расставайцеся...» (12+)
20.35 «Голас». Новы сезон. Фінал (12+).
22.25 Навагодні маскарад (16+).
23.50 Навагодняе віншаванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі.
0.05 Навагодняя ноч (16+)

СТБ

6.00, 6.40, 7.45, 8.40 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30** Навіны «24 гадзіны».
9.00 «Загадкі чалавецтва» (16+).
10.40 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.20 «Вадзіць па-руску» (16+).
12.40 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.40 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
16.00, 16.50 «Маёр і Магія». Серыял (16+).
20.00 «СТБ-спорт».
20.05 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 «Міншчына».
20.30 «Ёлкі». Камедыя (12+).
22.00 «Легенды СССР» (16+).
22.50, 0.05 Святочнае шоу «Навагодні блакітны агеньчык: назад у будучыню».
23.50 Навагодняе віншаванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі.
1.25 Музычны марафон «Легенды Рэтра FM» (16+).

МІР

5.15 Маст. фільм «Пунсовыя ветразі» [СЦ].
6.30 Маст. фільм «Агонь, вада і медныя трубы» [СЦ] (6+).
8.15 Маст. фільм «Папялушка» [СЦ].
10.00, 16.00 Навіны (бягучы радок).
10.10 Фестываль «Аўтарадыё» (12+).
14.30, 16.15, 18.15, 22.35, 0.00 Фестываль «Аўтарадыё». «Дыскатэка 80-х» (12+).
23.55 Навагодняе віншаванне.
1.35 Дыскатэка «20 гадоў» Аўтарадыё». Найлепшае» (12+).
4.30 Мультфільмы.

РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 14.00 Весткі.
11.10, 5.20 Камедыя «Утаймавальніца тыграў» (12+).
13.10, 14.10 Маст. фільм «Бландзінка за вуглом» (12+).
13.50, 16.50 Навіны — Беларусь.
15.10, 17.00 Маст. фільм «Навагодні экспрэс» (12+).
18.50 «Каралі смеху» (16+).
20.45 Маст. фільм «Адэскі параход» (12+).
22.15 «Навагодні парад зорак».
23.50 Навагодняе віншаванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі.
0.05 Навагодні блакітны агеньчык — 2021.

НТБ—Беларусь

6.00 «Астрапрагноз».
6.05, 7.00, 8.20 Сёння. Галоўнае.
6.10 Формы жыцця. Лясныя гісторыі. (6+).
6.20 Беларусы (6+).
7.15 «Здароўе» (12+).
8.00, 10.00, 16.00 Сёння.
8.30 Сфера інтарэсаў.
8.50 «Навукаманія» (6+).
9.25 «НЗ.by».
10.20 Спецыяльны рэпартаж (12+).
10.35 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).
12.20 Баявік «Адэсіт» (16+).
16.20 Зламаць стэрэатыпы (12+).
16.35 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў» (16+).
17.25 Меладрама «Навагодні шлюб» (12+).
19.15 Дэтэктыў «Навагодні пёс» (16+).
21.15 «Суперстар! Вяртанне» (16+).
23.50 Навагодняе віншаванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі.
0.05 Навагодні блакітны агеньчык — 2021.

8 канал

7.00, 15.25, 19.00, 21.25, 1.30 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 «Мультпарад» (6+).
7.30, 21.10 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Серыял «Зорны шлях» (12+).
8.25 Серыял «Дзіўныя гісторыі» (16+).
9.10 Прыгоды «Шчаўкунок і чатыры каралеўствы» (6+).
11.00 Серыял «Дзённікі вампіра» (16+).
11.50 Камедыя «Вакзал для дваіх» (12+).
14.10 Камедыя «Карнавальная ноч» (12+).
15.30 «Мультпарад». «12 месяцаў» (6+).
16.20 Камедыя «Чарадзеі». 1—2-я серыі (0+).
18.50 «Фэшн is my прафэшн» (12+).
19.05 Серыял «Мы з розных светаў» (16+).
21.15 «Вечарніца» (6+).
21.30 Трылер «Ціхаакіянскі рубеж». 1—2-я часткі (12+).

ВТБ

6.05 «Дурні і дарогі» (16+).
7.00, 14.00 «Раніца з гумарам» (16+).
10.35 Серыял «Кухня» (16+).
12.10 «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
13.15 «Наш рамонт» (16+).
15.50 Серыял «Лондан-град» (16+).
16.55, 4.00 «Уральскія пельмені» (16+).
18.00 Серыял «Кухня» (16+).
19.35 Серыял «Нагіеў на каранціне» (16+).
21.00 «Уральскія пельмені». Бітва фужэраў (16+).
0.00 «Уральскія пельмені». Справа пахне мандарынам (16+).
1.20 «Уральскія пельмені». Елка, дзеці, два сталы (16+).
2.40 «Уральскія пельмені». Краіна гірляндай (16+).

Культура

6.30, 7.00, 10.00 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...» Масква Савы Марозава.
7.05 Краіна птушак. «Тайнае жыццё камышовак». Дак. фільм [СЦ].
7.45 Раман у камені. «Шры-Ланка. Маўнт Лавінія». Дак. фільм.
8.10 Легенды сусветнага кіно. Яніна Жэймо.
8.40, 14.50 «Людзі і манекены». Маст. фільм [СЦ].
10.15 Кіно пра кіно. «Зігзаг удачы. Я, можна сказаць, яе кахаю». Дак. фільм [СЦ].
10.55 «Зігзаг удачы». Маст. фільм [СЦ].
12.25 XX стагоддзе. «Навагодні атракцыён — 1983». Вядучыя Ала Пугачова, Ігар Кіа.
16.10 «Дванаццаць месяцаў». М/ф.
17.10 Міжнародны фестываль цырка ў Маскве.
19.15 «Чыгунка». Кароткаметражны маст. фільм.
19.40 Аіда Гарыфуліна. Канцэрт у Буэнас-Айрэсе.
20.40 «Прывітанне, я ваша цётка!» Маст. фільм [СЦ].

22.25, 0.00 «Раманты-ка раманса». У коле сяброў.
23.55 Навагодні зварот Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Уладзіміра Уладзіміравіча Пуціна.
1.15 Луі Армстранг. Канцэрт у Аўстраліі.
2.15 «Песня не развітваецца... 1971».
2.50 «Цудоўны Гоша». Мультфільм для дарослых.

Настальгія

6.00 «Кінапанарама». 1981 год (16+).
7.40, 8.45, 9.45, 11.00, 12.45, 14.15, 15.45, 17.00, 5.00 Музычная настальгія (12+).
7.55 Фільм-канцэрт «З дазволу праграмы «Бенефіс» (12+).
9.00, 15.00, 21.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР».
12.00 «Яловая субмарына». «Машина времени» (16+).
12.55 «Вакол смеху». «Атэлье гумару». 1983 год (12+).
14.30 Фільм-канцэрт «Рытм, рытм, рытм» (12+).
18.00 Навагодні фільм-канцэрт «Выкраданне» (12+).
21.45 «Музычная гавань» (16+).
23.00 «Навагодняя музычная настальгія» (16+).

EuroSport 1

1.30 Алімпійскія гульні. Тэлечасопіс «Зала славы». Пекін-2008 (12+).
2.30 Алімпійскія гульні. Тэлечасопіс «Зала славы». Лондан-2012 (12+).
3.30, 7.00 Веласпорт. Чэмпіянат свету (12+).
5.00, 9.00 Снукер. Northern Ireland Open (6+).
10.30 Веласпорт. «Тур дэ Франс». Агляд (12+).
11.30 Веласпорт. «Джыра д'Італія». Агляд (12+).
12.30 Веласпорт. «Вуэльта». Агляд (12+).
13.30, 19.25 Скачкі на лыжах з трампліна.
17.15 Горныя лыжы. Кубак свету (12+).
20.30 Футбол. Дак. фільм Amando A Maradona (6+).
22.00 Веласпорт. «Тур дэ Франс» (12+).
23.30 Веласпорт. «Вуэльта» (12+).

Кінакамедыя

1.10 Найноўшы запавет (16+).
4.05 Як займацца каханнем па-англійску (18+).
5.55 Давай развядзёмся! (16+)
7.45 SuperАлібі (16+).
9.30 Начное жыццё (16+).
11.45 Прасцячка (16+).
13.40 З любоўю, Розі (16+).

15.30 Без заганы (16+).
17.35 Вялікі салдат (16+).
19.30 Пачатак часоў (16+).
21.20 Васабі (16+).
23.10 Шпіён па суседстве (12+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
8.40 «Улецы» (12+).
9.15 «Чарлі і шакаладная фабрыка». Маст. фільм (6+).
11.30 «Варажбітка» (12+).
13.40 «Карнавальная ноч». Дак. фільм (12+).
14.15 «Карнавальная ноч». Камедыя (0+).
15.45 «Палярны экспрэс». Анімацыйны фільм (6+).
17.30 «Адзін дома». Маст. фільм (0+).
19.30 «Адзін дома-2». Маст. фільм (0+).
21.50 «Адзін дома-3». Маст. фільм (12+).
23.50 «Новы год у прамым эфіры» (12+).
1.55 «У джазе толькі дзяўчаты». Маст. фільм (12+).
4.05 «Сем'янін». Маст. фільм (12+).

ТБ1000

5.00 Белфегар — прывід Луўра (12+).
7.10 Прадчуванне (16+).
9.10 Забытае (16+).
10.50, 3.00 Смурфікі (6+).
12.35 Смурфікі-2 (6+).
14.25 Мумія (12+).
16.35 Мумія вяртаецца (12+).
19.00 Цар скарпіёнаў (12+).
20.35 Мумія: Грабніца Імператара Цмокаў (16+).
22.30 Валяр'ян і горад тысячы планет (16+).
0.55 Добрай раніцы (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.30, 13.55 Ёлкі 1914 (6+).
7.15 Ёлкі кудлатыя (6+).
8.50, 20.40 Ёлкі (12+).
10.20, 22.20 Ёлкі-2 (12+).
12.10, 0.00 Ёлкі-3 (6+).
15.50, 1.40 Ёлкі-5 (6+).
17.25, 3.00 Ёлкі новыя (6+).
19.00, 4.20 Ёлкі апошнія (6+).

National Geographic

6.00 Навуковыя глупствы (16+).
6.20 80-я: дзесяцігоддзе, якое стварыла нас.
11.25, 1.55, 3.30 90-я: дзесяцігоддзе, якое нас аб'яднала (16+).
17.05, 23.30 2000-я: час, калі мы ўбачылі ўсё (16+).
18.30 Гісторыя дзесяцігоддзяў (16+).
19.20 Проста магія (16+).
21.00 Год у адкрытым космасе (16+).
21.50 Як уладкаваны інтэрнэт: 50 гадоў анлайн (16+).
0.20, 4.20 80-я (16+).
2.45 Год у адкрытым космасе (16+).

Discovery

8.00 Экспедыцыя на край зямлі (12+).
8.45, 18.03, 23.09 Гаражнае золата (12+).
9.35, 16.21 Махінатары (12+).
10.25 Як гэта зроблена? (12+)
11.15, 20.36 Бітвы за кантэйнеры (12+).
12.06 Як пабудаваць... што заўгодна (12+).
12.32, 4.56 Выратаванне Санта-Клауса (12+).
13.48 Рэактыўныя Каляды (12+).
21.27 Як гэта ўладкавана? (12+)
22.18 Круты цюнінг (12+).
0.00, 7.14 Залатая ліхаманка (16+).
0.51 Бітва самагоншчыкаў (18+).
6.05 Голыя і напалоханыя (16+).

Стымулы для топ-менеджараў

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Закладзены таксама новы падыход у рэгуляванні прававога становішча закрытых акцыянерных таварыстваў. Уведзены нормы, якія адмяняюць абмежаванні максімальнай колькасці ўдзельнікаў. Гэта значыць, ЗАТ можа быць з любой колькасцю акцыянераў.

Таксама адмяняецца абавязак пераважнага права куплі акцый. У той жа час ЗАТ па жаданні могуць захаваць пераважнае права. Калі адмовяцца, то акцыянеры маюць магчымасць прадаць свае акцыі любой трэцяй асобе без згоды іншых акцыянераў.

Закон закрануў і такое важнае пытанне, як дзейнасць назіральнага савета. У ім дэталізаваны працэдуры склікання і правядзення пасяджэнняў савета, удакладнёна кола асоб, якія маюць права на ініцыяванне пасяджэнняў, вызначаны парадак абскарджання рашэнняў наглядальнага савета.

Яшчэ адна навацыя з'явілася пасля аналізу практыкі работы з замежнымі ўдзельнікамі, патлумачыў міністр эканомікі. Распрацоўшчыкі прыйшлі да высновы, што асобныя абмежаванні, якія існуюць цяпер, перашкаджаюць стварэнню ў краіне замежных кампаній. У выніку адмяняецца забарона на стварэнне гаспадарчых таварыстваў з адным удзельнікам. Такія падыходы практыкуюць кітайскія інвестары. Акрамя таго, здымаецца абмежаванне колькасці ўдзельнікаў акцыянернага пагаднення.

Для павышэння рэйтынга

Трэці кірунак звязаны з нормамі, скіраванымі на абарону правоў і інтарэсаў удзельнікаў. У гэтым шэрагу трэба адзначыць права ўдзельнікаў на абскарджанне рашэнняў назіральных саветаў, калі такія рашэнні прынятыя з парушэннем заканадаўчых норм і статута таварыства ці парушаны правы і законныя інтарэсы ўдзельніка.

Законам дастаткова падрабязна і дэталёва рэгламентуюцца парадак і тэрміны ўнясення ўдзельнікамі прапаноў у парадак дня як гадавога, так і пазачарговага сходаў. Між іншым, дакладныя правілы і тэрміны правядзення агульнага сходу з'яўляюцца гарантам абароны правоў і інтарэсаў удзельнікаў, што мае значэнне пры ацэнцы Сусветным банкам дзелавога клімату краіны.

І, нарэшце, чацвёрты кірунак навацый звязаны з павышэннем інфармацыйнай адкрытасці. Закон прадугледжвае для ААТ абавязацельства раскрыцця звестак з асноўных планавых дакументаў (стратэгіі прагнозу развіцця, бізнес-плана). У дапаўненне да гадавога сходу ўдзельнікам будзе давацца інфармацыя аб стане чыстых актываў, аб гадавым узнагароджанні (прыбытку) членаў савета дырэктараў і выканаўчага органа таварыства, інфармацыя аб апцыённых праграмах, калі такія будуць.

Міністр перакананы, што ўсе гэтыя меры дазваляюць, па-першае, стварыць новыя формы крыніц інвеставання, па-другое, — магчымасці для фінансавага аздараўлення гаспадарчых таварыстваў, па-трэцяе, — умовы для доўгатэрміновай матывацыі работнікаў таварыстваў і развіцця апцыённых праграм. Акрамя таго, усё гэта палепшыць практыку карпаратыўнага кіравання, узмоцніць абарону правоў удзельнікаў і павысіць рэйтынг нашай краіны ў справаздачы Сусветнага банка «Вядзенне бізнесу».

Сенатары пагадзіліся з гэтымі довадамі і падтрымалі законапраект.

СТАМІЛІСЯ АД РЭКЛАМЫ Ў ПАШТОВАЙ СКРЫНІ І Ў ТРАНСПАРЦЕ?

Хутка яе там не будзе. Сенатары ўхвалілі праект Закона «Аб змяненні законаў па пытаннях рэкламы»

На заключнай сёлета сесіі верхняй палаты парламента міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Уладзімір КАЛТОВІЧ прэзентаваў актуальныя змяненні, якія былі прынятыя дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў у другім чытанні.

Добрыя навіны

Самае галоўнае — гэта абарона спажыўцоў ад агрэсіўнай рэкламы. Як паведаміў міністр, законапраектам прадугледжваецца абавязак рэкламадаўцы і рэкламараспаўсюджвальніка спыніць дастаўку ў паштовую скрыню рэкламы па першым патрабаванні яе ўладальніка. І больш ніякага «спама»... Што датычыцца распаўсюджвання рэкламных прапаноў праз электронную скрыню і па тэлефоне, рэкламадаўцу першапачаткова трэба атрымаць згоду адрасата, прычым у пісьмовай (электроннай) форме.

Гэта актуальна ў тым ліку для рэкламы рытуальных паслуг, якая «сустракае» спажыўца не толькі ў паштовай, але і электроннай скрыні, у форме тэлефонных званкоў і розным іншым чынам. Асабліва пакутуюць ад такой навязлівай кампаніі людзі сталага веку, якія скардзяцца ў дзяржорганы на нетактоўныя дзеянні рэкламадаўцаў.

Прагрэсіўнай часткай змяненняў можна назваць забарону на гукавую рэкламу ў грамадскім транспарце: больш ніякіх крыклівых прапаноў у дарозе — толькі прыгожыя краявіды за акном! Дарэчы, гэта датычыцца і выкарыстання на стаянках прычэпаў, прыпаркаваных не па прызначэнні — на іх таксама ніякай рэкламы больш не павінна з'яўляцца.

Цікавым момантам можна назваць і тое, што законапраектам уводзяцца патрабаванні да рэкламы, звязанай з працаўладкаваннем за мяжой — без пастак у выглядзе абяцанак вялікіх грошай: толькі рэальныя прапановы, якія могуць быць дакументальна пацверджаны і ўтрымліваюцца ў дагаворы працаўладкавання.

Таксама прадугледжваюцца патрабаванні да рэкламы банкаўскіх паслуг, мікрафінансавых арганізацый, дзейнасці на рынку «Форэкс».

Істотным для спажыўца з'яўляецца і тое, што забараняецца рэклама нетытунёвых нікацінамяшчальных вырабаў і вадкасцяў для электронных сістэм курэння, за выключэннем такой рэкламы на сайтах іх вытворцаў і імпарцёраў у нацыянальным сегменце «сусветнага павуцення».

Зніжкі на лекі? Калі ласка!

Што да суб'ектаў гаспадарання, то тут таксама з'явіліся навацыі, якія знімаюць лішнія патрабаванні і бар'еры на рэкламным рынку краіны. Як растлумачыў Уладзімір Калтовіч, для рэалізацыі плана лібералізацыі па сектары паслуг у галіне рэкламы і па прапановах суб'ектаў рэкламнага рынку выключаюцца патрабаванні аб вырабе рэкламы айчынных тавараў (работ, паслуг) і знадворнай рэкламы выключна з прыцягненнем арганізацый і грамадзян нашай краіны, а таксама аб выкарыстанні ў такой рэкламе толькі вобразаў беларускіх грамадзян.

Міністр дадаў, што для выключэння залішніх патрабаванняў і бар'ераў на гэтым рынку прадугледжваецца магчымасць рэкламавання на замежнай мове назваў культурных, турыстычных мерапрыемстваў, спартыўных каманд, спаборніцтваў, конкурсаў і ўзнагарод.

Акрамя таго, скарачаецца аб'ём медыцынскай рэкламы, якая патрабуе абавязковага ўзгадненя ў Міністэрстве аховы здароўя. Дазваляецца паведамляць аб зніжках у рэкламе лекаў, вырабаў медыцынскага прызначэння, медтэхнікі, біялагічна актыўных дабавак да ежы.

Дазваляецца рэкламаванне грамадзянскай зброі на інтэрнэт-сайтах.

Таксама распрацоўшчыкамі законапраекта падтрымана прапанова суб'ектаў рэкламнага рынку аб праве выкарыстоўваць у сацыяльнай рэкламе, акрамя назвы спонсараў, іх таварныя знакі, эмблемы і іншую сімволіку.

Вельмі істотнай навацыяй з'яўляецца і адмена абавязку рэкламараспаўсюджвальніка патрабаваць, а рэкламадаўцы — прад'яўляць дакументы аб дзяржаўнай рэгістрацыі апошняга.

Як патлумачыў калегам **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл РУСЫ,** прыняцце законапраекта будзе садзейнічаць сістэмнаму і ўзгодненаму прававому рэгуляванню ў сферы ажыццяўлення рэкламнай дзейнасці. Законапраект, разгледжаны на пасяджэнні профільнай камісіі і рэкамендаваны да ўхвалення членамі Савета Рэспублікі, апошнімі быў падтрыманы.

АДКУЛЬ СВІНІНА? НЕ З ЛЕСУ, ВЯДОМА...

Усіх сельскагаспадарчых жывёл, птушак, трусоў, пчол і нават ракаў ідэнтыфікуюць

Навошта? Аб гэтым падрабязна расказаў намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Ігар БРЫЛО на чацвёртай сесіі Савета Рэспублікі, якая завяршыла сваю работу ў мінулую пятніцу.

Усё пад кантролем

Паводле яго слоў, змяненні ў Законе «Аб ідэнтыфікацыі, рэгістрацыі, прасочваемасці сельскагаспадарчых жывёл (статкаў), ідэнтыфікацыі і прасочваемасці прадуктаў жывёльнага паходжання» пасадзейнічаюць павышэнню бяспекі пры перамяшчэнні жывёл (статкаў) і прадуктаў жывёльнага паходжання як па нашай краіне, так і паміж дзяржавамі — членамі ЕАЭС. Таксама гэта дазволіць ліквідаваць бар'еры ў сферы выкарыстання ветэрынарна-санітарных мер пры ўзаемным гандлі і паўплывае на павышэнне экспартнага патэнцыялу айчынных сельгасвытворцаў.

Трэба сказаць, што на сённяшні момант у адмысловай дзяржаўнай інфармацыйнай сістэме ідэнтыфікавана і зарэгістравана ўсё пагалоўе буйной рагатай жывёлы, авечак, коз, коней і свіней, якія ўтрымліваюцца на жывёлагадоўчых аб'ектах краіны. Так, з 2017 года там размешчана інфармацыя аб 11,5 мільёна галоў буйной рагатай жывёлы, 14,5 мільёна свіней, 51 тысячы авечак, 8,7 тысячы коз і 28 тысячах коней.

Дарэчы, усе мясакамбінаты вырабляюць і рэалізуюць сваю прадукцыю толькі з жывёл, якія ідэнтыфікаваны і зарэгістраваны ў гэтай інфармацыйнай сістэме. Паказана тут і інфармацыя аб вырабленай прадукцыі і адгрузках. Напрыклад, у Расію за ўвесь мінулы перыяд работы зарэгістравана больш за паўмільёна адгрузак. На сённяшні момант да сістэмы падключаны 1577 суб'ектаў гаспадарання, пераважная большасць з якіх — 1277 — ажыццяўляе экспартныя пастаўкі прадукцыі жывёлагадоўлі.

Што новага?

Па словах Ігара Брыло, змяненні скіраваны на пашырэнне спіса сельскагаспадарчых жывёл, якія падлягаюць ідэнтыфікацыі і рэгістрацыі. Так, цяпер у яго трапляюць 23 новыя віды жывёл: дадаюцца куры, гусі, качкі, індычкі, перапёлкі, цацаркі, страусы, пчолы (пчоласем'і), лісы, норкі, трусы, нутрыі, бабры, пясцы, сабалі, тхары, андатры, выдры, янотападобныя сабакі, рыбы, крабы, амары і рачны рак. Гаворка ідзе аб тых, што разводзяцца і вырошчваюцца ў напалову вольных умовах ці штучна створаным асяроддзі.

Гэта датычыцца і змен у спісе прадуктаў сельгасперапрацоўшчыкаў, што вырабляюцца з гэтых жывёл.

Павялічваецца колькасць і разнастайнасць сродкаў ідэнтыфікацыі для такіх жывёл. Акрамя стандартных бірак для буйной рагатай жывёлы, якія і далей будуць выкарыстоўвацца, таксама з'явяцца нашыйнік, нашыйнік з мікрачыпам, нажное колца, метка на крыло, табло. Дарэчы, ідэнтыфікацыя буйной рагатай жывёлы, авечак, коз, свіней і коней будзе працягвацца ў межах дзеючага заканадаўства.

На пераходны перыяд, пакуль работа па ідэнтыфікацыі і рэгістрацыі 23 новых відаў жывёл будзе завершана, распрацоўшчыкі законапраекта адводзяць два гады.

Ад фермы да стала

Як патлумачыў сенатарам **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл РУСЫ,** пытанні забеспячэння бяспечнасці харчовай і нехарчовай прадукцыі жывёльнага паходжання патрабуюць новых крокаў у развіцці гэтага кірунку.

— Глабалізацыя стандартаў у гандлі і непарыўнасць харчовых ланцужкоў, калі сыравіна і кампаненты набываюцца вытворцамі ў розных краінах, а прадукцыя пастаўляецца праз транснацыянальныя гандлёвыя сеткі па ўсім свеце, патрабуе ўзгодненых на заканадаўчым узроўні падыходаў да ідэнтыфікацыі і прасочваемасці сыравіны, — падкрэсліў ён. — Гэта неабходны ў сучасных умовах развіцця гандлю механізм забеспячэння бяспекі нашых грамадзян. Прынцыпы прасочваемасці прадуктаў «ад фермы да стала» даўно ўжо выкарыстоўваюцца ва ўсім свеце.

Старшыня профільнай камісіі звярнуў увагу, што бяспечнасць выкарыстання вырабленай прадукцыі забяспечваецца наяўнасцю ідэнтыфікацыйнага нумара ў жывёлы, рэгістрацыі звестак аб ёй у нацыянальнай інфармацыйнай сістэме, якія дазваляюць вызначыць паходжанне, месца і нават умовы ўтрымання жывёлы, у тым ліку і яе забой.

Ён таксама адзначыў, что прыняцце і рэалізацыя законапраекта дазволіць ажыццяўляць дзяржаўнае рэгуляванне колькасці жывёлы (статкаў) у краіне, забяспечыць кантроль за аб'ёмамі ўвозу і рэалізацыі прадуктаў жывёльнага паходжання. З прапановай падтрымаць законапраект яго калегі пагадзіліся.

Вольга АНУФРЫЕВА.

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

АКЦЭНТ НА ЯКАСЦЬ

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ правёў асабісты прыём грамадзян.

Першы наведвальнік Анастасія Аляксандраўна шчыра прызналася: да апошняга моманту не спадзявалася на тое, што трапіць на прыём. Бо не ва ўсіх інстанцыях, куды яна звярталася па падтрымку і паразуменне, з ёй пажадалі сур'ёзна размаўляць па сутнасці яе справы.

А яна, гэтая справа, вельмі няпростая. Яе муж у цёмны час сутак трапіў у дарожна-транспартнае здарэнне — пратараніў на шашы аўтамабіль, які стаяў без габарытаў святла. Потым былі расследаванне і экспертызы ДАІ, раённы і два абласныя суды, з рашэннямі якіх жанчына не згодная. Вось і звярнулася ў Савет Рэспублікі, паводле яе слоў, у пошуку справядлівасці.

Сяргей Рачкоў уважліва выслухаў яе, задаваў удакладняльныя пытанні, адказы на якія пераконвалі яго ў тым, што дадзеная сітуацыя даволі складаная. Ды і Савет Рэспублікі не можа ўмешвацца ў дзейнасць судоў. Але старшыня профільнай камісіі паабяцаў, што дакументы, якія прынесла на прыём жанчына, па яго просьбе яшчэ раз разгледзяць, вывучаць абставіны справы, паспрабуюць дапамагчы, зразумела, строга ў рамках закона.

Сёлета гэта быў апошні асабісты прыём грамадзян старшынёй Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы. Натуральна, размова з карэспандэнтам «МС» зайшла і аб папярэдніх выніках работы яе членаў са зваротамі, пісьмамі і сігналамі грамадзян, у тым ліку і індывідуальных прадпрымальнікаў, а таксама іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб. Сяргей Рачкоў адзначыў, што для гэтай катэгорыі наведвальнікаў удалося зрабіць нешта карыснае. Напрыклад, большасць з іх скардзілася на несправядлівае спагнанне падаткаў, стрымліванне дзелавой ініцыятывы асобнымі чыноўнікамі. Дзякуючы намаганням Пастаяннай камісіі асобныя спрэчныя пытанні былі вырашаны станоўча для аўтараў такіх зваротаў.

На працягу года члены Пастаяннай камісіі рабілі акцэнт на якасці разгляду зваротаў, імкнуліся нефармальна адносіцца да вырашэння праблемы, з якой быў вымушаны прыйсці да іх той ці іншы чалавек. Усяго за 2020 год сенатары разгледзелі не адну сотню зваротаў грамадзян як падчас асабістых прыёмаў, прамых тэлефонных ліній, так і ў час выязных прыёмаў, сустрэч у працоўных калектывах, кажа Сяргей Анатольевіч.

У наступным годзе работа са зваротамі грамадзян будзе працягнута. А наконт асабістага вопыту Сяргей Рачкоў лічыць, што сустрэчы, нават тэлефонныя размовы дазваляюць яму і калегам па верхняй палаце парламента быць бліжэй да людзей, заставацца ў курсе іх клопатаў і праблем.

Леанід ТУГАРЫН.

ДЗЕНЬ ЗА ДНЁМ

У новым пашыраным фармаце

Падвялі вынікі работы за 2020 год члены Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці. У час яе пашыранага пасяджэння, якое адбылося ў канцы мінулага тыдня, абмеркаванне бягучых пытанняў сумясцілі з навучаннем памочнікаў сенатараў.

Старшыня Пастаяннай камісіі Віктар ЛІСКОВІЧ растлумачыў гэта рашэнне жаданнем і неабходнасцю павысіць ролю памочнікаў у ажыццяўленні функцый сенатараў на месцах. У ходзе работы камісіі быў зацверджаны план работы на наступны год. Калі сёлета падрыхтаваны і рэкамендаваны да разгляду Саветам Рэспублікі пяць законапраектаў, то ў 2021 годзе іх запланавана ўжо пятнаццаць. Відавочна, што сенатараў чакае напружаная заканатворчая праца, эфектыўнасць якой у немалой ступені будзе залежаць ад прафесійнай падрыхтоўкі, кемлівасці, аператыўнасці памочнікаў, а таксама іх работы са зваротамі грамадзян, здольнасці наладзіць кантакты з працоўнымі калектывамі, мясцовымі уладамі, паведаміў старшыня профільнай камісіі.

Памочнікам была дадзена магчымасць убачыць працэс разгляду і непасрэдна адчуць атмасферу працэдуры разгляду законапраектаў сенатарамі. З гэтай мэтай да ўдзелу ў пасяджэнні быў запрошаны старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Аляксандр Шумілін. Ён выказаў сваё меркаванне і абазначыў падыходы калег-навукоўцаў у сувязі з неабходнасцю ўнясення змяненняў і карэкціроўкі законаў аб навуковай, навукова-тэхнічнай дзейнасці, адказаў на заўвагі і пытанні прысутных.

Сярод важных законапраектаў, якія будуць разгледжаны ў хуткім часе, напрыклад закон «Аб турызме». Для краіны і яе грамадзян апошні — важная сфера дзейнасці, у ёй напрамую ці ўскосна занятыя многія тысячы грамадзян Беларусі. Асаблівая ўвага сенатарамі будзе аддадзена выпрацоўцы мер па актыўным развіцці ўязнога турызму з мэтай шырокага прыцягнення на адпачынак, стымулявання ўдзелу ў экскурсіях па знакамітых мясцінах Беларусі замежнікаў з розных краін свету і тым самым папаўнення валютных запасаў краіны. З гэтай нагоды ў Пастаяннай камісіі плануюць правесці грунтоўнае тэматычнае пасяджэнне па турыстычнай праблематыцы, каб абмеркаваць усе аспекты будучага законапраекта.

У полі зроку сенатараў будзе і актуалізацыя шэрагу законаў, прыняцце сацыяльна арыентаваных законапраектаў, якія датычацца далейшага паляпшэння аказання медыцынскай дапамогі насельніцтву, клопату аб інвалідах і састарэлых, ветэранах, людзей з абмежаванымі магчымасцямі, павышэння працоўных пенсій.

Зразумела, на працягу года члены Пастаяннай камісіі актыўна працавалі з грамадзянамі: праводзілі асабістыя прыёмы наведвальнікаў як у Савеце Рэспублікі, так і ў рэгіёнах, ладзілі прамыя тэлефонныя лініі, сустрэчы і дыскусіі ў працоўных калектывах, актыўна супрацоўнічалі з цэнтральнымі і мясцовымі электроннымі і друкаванымі сродкамі масавай інфармацыі, стварылі акаўнт-камісіі ў сацыяльнай сетцы Instagram.

Леанід ТУГАРЫН.

Больш за тысячу зваротаў з пачатку года...

...паступіла ў Пастаянную камісію па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі. Прыкладна палова зваротаў вырашана на карысць іх аўтараў. Аб гэтым паведаміў старшыня Пастаяннай камісіі Міхаіл РУСЫ падчас чарговай прамой тэлефоннай лініі.

Людзі звярталіся па шырокім тэматычным коле праблем. Было відавочна, што іх па-ранейшаму хвалююць недапрацоўкі мясцовых улад, хібы ў рабоце арганізацый і службаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Тут звароты датычыліся капітальнага рамонту дамоў, падтрымання ў зімовы перыяд належнай тэмпературы ў кватэрах, у тым ліку і шляхам уцяплення фасадаў. Прасілі дапамагчы разабрацца і з добраўпарадкаваннем дваровых тэрыторый, прывядзеннем у парадак аўтамабільных дарог. Выказвалі цікавыя прапановы варыянтаў транспартнага падатку (інакш кажучы, дарожнага збору) для ўладальнікаў машын, пыталіся і пра выкарыстанне чэкаў «Маёмасць», задавалі іншыя пытанні.

Пазней Міхаіл Русы не толькі пракаментаваў журналістам званкі, якія паступілі падчас прамой лініі, але і падвёў папярэднія вынікі дзейнасці Пастаяннай камісіі і калег-сенатараў па рабоце з грамадзянамі. Паводле яго слоў, прамая тэлефонная лінія — гэта працяг той работы, што мэтанакіравана і пастаянна вядзецца Саветам Рэспублікі. Сенатар адзначыў: нямала цікавых прапаноў па ўдасканаленні дзеючага заканадаўства паступае ад неабыякавых людзей, якія падказваюць аб пэўных прабелах у тым ці іншым законе. Гэтыя заўвагі заўсёды ўлічваюцца парламентарыямі ў іх дзейнасці пры актуалізацыі пэўных заканадаўчых актаў.

Старшыня камісіі падзяліўся назіраннямі са свайго вопыту правядзення асабістых прыёмаў грамадзян і прамых тэлефонных ліній. На яго думку, людзям трэба больш актыўна і самастойна абапірацца на сілу закона пры адстойванні правоў, у барацьбе за ўстанаўленне справядлівасці. І пры неабходнасці звяртацца ў мясцовыя праваахоўныя органы, суды, а не адразу пісаць у вышэйшыя дзяржаўныя інстанцыі і праз іх аўтарытэт спрабаваць дасягнуць патрэбнага вырашэння пытання. Варта памятаць: у рэшце рэшт усё будзе зроблена па законе.

— Мы ў Пастаяннай камісіі ўзялі за правіла прама казаць наведвальнікам падчас прыёму грамадзян, у ходзе прамой лініі, аб верагодных перспектывах станоўчага ці адмоўнага вырашэння іх пытання. Калі няма законных падстаў дапамагчы чалавеку, то мы так і кажам людзям, навошта іх дарэмна абнадзейваць, — гаворыць Міхаіл Русы.

На працягу года нямала зваротаў паступіла ў камісію ад шматдзетных сем'яў, пісалі і тэлефанавалі пра цяжкасці падзелу нерухомай уласнасці, скажам, пасля разводу мужа і жонкі, смерці бацькоў, сваякоў.

Сярод пастаянных тэм — зямельныя пытанні. І даволі часта іх аўтары самі вінаватыя ў праблемах, якія ўзніклі. Напрыклад, выдзелілі ўчастак зямлі пад вядзенне асабістай прысядзібнай гаспадаркі, а замест хляўчука для парсючкоў там узводзяць дом на тры паверхі. І потым скардзяцца на мясцовую ўладу, якая адмаўляецца ўзаконіць будынак. А як інакш — закон не дазваляе гэтага зрабіць.

Так, сёння чалавек павінен быць абаронены, лічыць Міхаіл Русы. У сувязі з гэтым ён звярнуў увагу на тое, што ўлады на месцах нярэдка фармальна ставяцца да вывучэння зваротаў грамадзян, што дасылаюцца з камісіі для разгляду і прыняцця мер. Амаль 35 працэнтаў такіх адказаў з органаў мясцовай улады даводзіцца адсылаць назад для больш уважлівага вывучэння сітуацыі і прыняцця ўважанага рашэння па дадзенай праблеме. Скажам, стварэння безбар'ернага асяроддзя для інвалідаў.

